Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 16 1933 г.

№ 131 (4675)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Узьняць тэмпы торфаздабычы. І. А. ЛЫЧОЎ—Першыя ўрокі (2 стар.).

В. МАЕЎСКІ—фасфарытныя багацьці БССР (3 стар.).

ПРАМОВА ТАВ. ЛІТВІНАВА НА ЛЕНДАНСКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ канфэрэнцыі (4 стар.).

Выпраўленьне на-ходу недахопаў першых дзён чысткі—задача праверкомаў і усёй партарганізацыі (3 стар.).

М. МОДЗЭЛЬ—Буйнейшы фактар інтэрнацыянальнага выхаваньня (4 стар.).

Усесаюзнае спаборніцтва па цяжкай атлетыцы (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Арышт супрацоўніка аўстрыйскага пасольства ў Бэрліне (2 стар.).

Жорсткія прысуды за распаўсюджваньне «Ротэ Фанэ» (2 стар.).

УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ ТОРФАЗДАБЫЧЫ

З году ў год расьце і пашыраецца апалавая база сацыялістычнай прамысловасьці БССР. Асвойваюцца новыя сотні гэктараў балотных масываў. Сэзон 1933 году павінен даць фабрыкам, заводам і працоўнаму насельніцтву звыш паўтара мільёна торфапалу і тарфяной падсьцілкі для ўгнаеньня калгасных палёў. Галоўным пастаўшчыком апалу для прамысловасьці зьяўляецца **Белторф**, перад якім пастаўлена задача—здабыць у бягучым сэзоне **493 тыс.** тон высокакаякаснага апалу.

Ня менш важная задача ўскладзена на торфаарцелі прамысловай кааперацыі, якія павінны здабыць **550 тыс.** тон апалу, прызначанага для фабрык і заводаў, і галоўным чынам, для забесьпячэньня апалам працоўнага насельніцтва.

Прадпрыемствы сыстэмы Белторфу сёлета значна лепш падрыхтавалі балотныя масывы для торфаздабычы, чым летась. Сваячасова былі прыведзены ў баявую гатоўнасьць асноўныя механізмы, агрэгаты і абсталяваньне. Усё гэта дало магчымасьць Белторфу распачаць торфаздабычу на шэсьць дзён раней вызначанага пляном тэрміну. І ўжо 5-га мая (тэрмін пачатку сэзону) **9 перадавых торфазводаў далі краіне 2.878 тон торфу.**

Рабочай сілай да пачатку сэзону торфапрамысловасьць была забясьпечана на **126 проц. Партыйная, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі** павінны былі толькі перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва нізавым вытворчым зьвяном і на падставе шырокай палітыка-масавай і выхаваўчай работы ўстанавіць жалезную пралетарскую дысцыпліну, жорстка змагацца з лодырамі, рвачамі і прагульшчыкамі. Трэба было вопыт работы лепшых ударнікаў перанесьці ва ўсе адсталыя брыгады з тым, каб узьняць тэмпы торфаздабычы. На жаль, гэтага на зроблена. Кіраўнікі большасьці торфзаводаў не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Усё гэта прывяло да зьніжэньня здабычы. Лёкамабілі перасоўваюцца па 2 гадзіны замест 20 мінут, прадугледжаных плянам. Машыны і агрэгаты напружаны ў сярэднім **на 70 проц.** Сярэднясутачная здабыча торфу не перавышае **30-35 проц.** На 25 мая калядарнае задань не было выканана **на 65 проц.**, а на 11 чэрвеня ўсяго **на 42 проц.** Ад пачатку сэзону недадана краіне **72.396 тон торфу.**

У чым справа? Справа заключаецца ў тым, што да гэтага часу торфазаводы працуюць мэтадамі мінулых гадоў. Моцна ўкаранілася ў торфапрамысловасьці старыя традыцыі арцельшчыны. І калі групу людзей, працуючых на агрэгатах і ў кар'еры, называюць брыгадай, то гэта простае «очковтирательство». Па сутнасьці нізкіх вытворчых брыгад на торфазводах няма, а ёсьць арцель, на чале з арцельным старастай.

Так было тры гады назад, так засталося і на сёнешні дзень. Гаспадар нікі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі фармальна назвалі гэтыя арцелі брыгадамі, ня вызначылі правоў і абавязкаў брыгадзіра, як адміністратара ў брыгадзе, які павінен кіраваць барацьбой за плян торфаздабычы. Вельмі часта ўдзельнікі брыгады скарыстоўваюць сваіх брыгадзіраў для патрабаваньня дадатковых талёнаў на абеды, на апрымаўшае цукру і іншых прадуктаў. **І калі брыгадзір ня выконвае волі адсталай часткі рабочых, тады яны патрабуюць ад кіраўніцтва правесьці выбары новага брыгадзіра. А калі заводакіраўніцтва на гэта не згаджаецца, тады рвачы, а часам і клясава-варожыя элемэнты, прымаюць усе захады да кампрамэта цыі брыгадзіра.**

Такая сыстэма кіраўніцтва нізавым вытворчым зьвяном прыводзіць да парушэньня працоўнай дысцыпліны, да вялізарных прастояў лёкамабіляў і аграгатаў.

Камуністаў і камсамольцаў у брыгаду і кар'ер кіраўнікі заводу да гэтага часу не паслалі, ня гледзячы на выразнае аб гэтым указаньне сакратарыяту ЦК КП(б)Б: «Забясьпечыць правільную расстаноўку партсіл і перасунуць асноўную масу камуністаў і камсамольцаў з апарата і другарадных работ на вытворчасьць, вылучыць у іх парторгаў». (З пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 8 чэрвеня).

Да выкананьня гэтай важнейшай пастановы ня ўсюды яшчэ прыступілі.

На Асінторфе, **дзе 40 членаў і кандыдатаў партыі, не знайшлося ні аднаго партыйца для непасрэднай работы па торфаздабычы.** Сакратар парткалектыву **Марголін** хоча стварыць інстытут наглядчыкаў за ходам работы машын. На гэтыя пасады ён мяркуе паслаць камуністаў і камсамольцаў.

У канцы мая пры ЦК КП(б)Б адбылася нарада кіраўнікоў партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый тарфяной прамысловасьці. На гэтай нарадзе яны абяцалі дабіцца рашучага пералому ў рабоце, абяцалі выконваць штодзённыя заданьні па торфаздабычы. Для гэтага абавязаліся паслаць камуністаў і камсамольцаў у нізавое вытворчае зьвяно для практычнай работы па торфаздабычы.

Аднак, абяцаньні ня былі падмацаваны справай. Толькі на адным торфазводзе **«1 мая»** паслана 4 партыйца ў кар'ер.

Торфпрафкомы па большасьці заводаў займаюцца дэклярацыямі, высоўваюць сустрэчныя лічбы торфаздабычы і ніякай работы па арганізацыі мас на барацьбу за плян не вядуць. Кіраўніцтва брыгадай ажыцьцяўляецца наогул, ні ў аднэй брыгадзе няма прафарганізатараў.

Некаторыя кіраўнікі партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый схільны думаць, што пастанова СНК і ЦК УсеКП(б) **«аб кіраўніцтве шахтай, капальняй, трэстам»** іх прадпрыемствам зусім не датычыць. Гэта пастанова ня толькі не знайшла свайго практычнага праламленьня ў рабоце торфапрамысловасьці, а нават не абгаворана на сходах брыгад.

Прафсаюзы, пачынаючы ад ЦП (старшыня **Горагляд**) і канчаючы торфпрафкомамі, не займаюцца як на лежыць пытаньнямі арганізацыі працы, зарплаты, не вядуць барацьбы з абязьлічкай і ўраўнілаўкай. **У выніку-ж 600 рабочых пакінулі торфазводы ў самым пачатку сэзону.**

На Асінторфе (дырэктар ЛЯШЧЫНСКІ), зав. «Шлях сацыялізму» (дырэктар Шэбэка), імя Даўмана (дырэктар Крывашзеў) рабочыя не атрымлівалі абедаў і кватэры на працягу 5 дзён і яны цэльмі брыгадамі адыходзілі з прадпрыемства. Словы тав. **Кагановіча аб штодзённых клопатах па паляпшэньні культурна-бытавога і матар'яльнага становішча рабочых не ажыцьцяўлены.**

На торфазводзе **імя Гея** праўленьне торфрабкопу вынесла пастанову, у якой забараняе загадчыку сталоўкі выдаваць лыжкі тарфянікам. Адзін гэты факт сьведчыць аб тым, што кіраўнікі заводу ператварыліся ў бяздушных бюракратаў і апрача складаньня пастаноў нічога больш рабіць няздольны.

Растраты па торфрабкопу за 1932 год складаюць 110 тыс. руб. Увесь пайвы капітал далкам растрачан. У першым квартале бягучага году растрачана 20 тыс. руб. Сакратар Грабнеўскага торфрабкопу **Астроўскі** на працягу аднаго месяца растраціў **400 руб.** Аднак, гэта яму не перашкаджае заставацца на тэй-жа пасадзе толькі таму, што яго брат зьяўляецца сакратаром партыйнай ячэйкі таго-жа заводу.

Ня лепш, а нават горш стаіць справа з выкананьнем вытворчай праграмы арцелямі прамкааперацыі. Кіраўнік Белпрамторфкааперацыі т. **Сорын** ня толькі ня здолеў забясьпечыць апэрацыйнага кіраўніцтва арцелям, а ён нават не дабіўся інфармацыі з месц аб ходзе работ. Ён ня ведае, як працуюць арцелі.

Цярпець у далейшым такія агіднасьці, якія творацца амаль на ўсіх торфараспрацоўках, гэта значыць сарваць торфаздабычу, сарваць бесьперабойнае забесьпячэньне сацыялістычнай прамысловасьці апалам.

«Невыкананьне вытворчай праграмы па торфаздабычы, уборцы і сушцы будзе разглядацца партыяй, як невыкананьне яе важнейшых дырэктыў» (з прамовы тав. Гікало на нарадзе тарфянікаў пры ЦК КП(б)Б).

Забясьпечыць выкананьне вытворчай праграмы па торфаздабычы можна толькі пры ўмове, калі дзесятнікі і інжынэры з канцылярый пойдуць на балота, дапамогуць брыгадам асвоіць тэхніку машын і агрэгатаў. Мэтады работы мінулых гадоў неабходна зьнішчыць. Брыгадзір на агрэгаце, а таксама на ўборцы і сушцы торфу павінен атрымаць права не арцельнага старасты, а сапраўднага ад міністратара, барацьбіта за прамфінплян.

Кожнай брыгадзе даць партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага арганізатара. Іх абавязак—**стаць на нізжэйшую ступень кар'еру і паказаць прыклад у рабоце па здабычы торфу. Іх задача — узьняць жалезную пралетарскую дысцыпліну, арганізаваць працу, зарплату і прыцягваць да ўдзелу ў грамадзкім жыцьці заводу шырокія масы рабочых тарфянікаў і тарфяніц.**

Кіраўніком торфрабкопу, сталовых час адмовіцца ад ролі прыказчыкаў. Ад іх партыя патрабуе ператварыць сталовыя ва ўзорныя цэхі заводаў. Кааператарам неабходна ведаць ня толькі шлях да калгасаў і вёсак, у якіх яны праводзяць самазагатоўкі прадуктаў, а ведаць жывых людзей. Практыка паказала, што заключыць дагавор з калгасам на дастаўку прадуктаў—гэта далёка ня ўсё. Трэба растлумачыць калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам значэньне самазагатовак у справе паляпшэньня грамадзкага харчаваньня рабочых заводаў.

Кожны камуніст, камсамолец павінен усьвядоміць тыя задачы, якія на яго ўскладзены партыяй і ўрадам у справе ўзьняцьця тэмпаў торфаздабычы. Права называць сябе большавіком атрымае той, хто пакажа прыклад у барацьбе за паўтара мільёна тон торфу ў сэзоне.

Пакончыць з недаацэнкай ворыва папараў, у тэрмін і добра ўзараць чыстыя папары!

ВОРЫВА ПАПАРАЎ НА 10 ЧЭРВЕНЯ

ЗВОДКА НКЗ БССР

РАЁНЫ:	УЗАРАНА.	ПРОЦ.
Асьвейскі	19	0,4
Аршанскі	698	7,7
Вушацкі	158	2,9
Дрысенскі	48	1,0
Лепельскі	100	1,4
Быхаўскі	7301	66,4
Барысаўскі	1905	2,8
Бягомльскі	335	8,4
Бярэзінскі	772	12,9
Горацкі	79	1,0
Заслаўскі	1520	25,3
Клімавіцкі	971	13,9
Капыльскі	298	6,0
Касьцюковіцкі	372	2,7
Дзяржынскі	1567	22,4
Магілеўскі	1540	12,8
Чавускі	413	3,6
Чэрыкаўскі	227	5,7
Шклоўскі	572	7,2
Вузьдзенскі	81	3,2
Плешчаніцкі	2017	40,3
Менскі	4249	20,8
Пухавіцкі	1611	20,1
Смалявіцкі	1384	16,3
Талачынскі	74	0,6
Брагінскі	268	10,7
Бабруйскі	214	2,9
Веткаўскі	219	1,6
Гомельскі	112	2,8
Кармянскі	53	1,0
Парыцкі	1338	89,2
Рагачоўскі	2416	20,1
Рэчыцкі	699	7,0
Слуцкі	392	13,1
Старобінскі	378	31,5
Ст.-Дароскі	301	10,0
Чачэрскі	105	1,9
Ч.-Слабодзкі	1293	51,7
Уваравіцкі	8	0,2
По БССР:	36753	8,8

За пяцідзеўку — **НІЯКІХ ЗЬМЕН!**

Як і раней, у зводцы аб ходзе ворыва папараў фігуруюць толькі паасобныя раёны. Улік ворыва папараў **НЕ НАЛАДЖАН** і ні сёнешні дзень. Дзесяткі раёнаў па-ранейшаму не дасылаюць ніякіх вестак.

А Наркамзем, відавочна, прымірыўся з гэтым недапушчальным фактам. Няўжо-ж так цяжка арганізаваць пяцідзённы ўлік? Няўжо-ж наркамат ня мае ніякіх сродкаў узьдзеяньня на райземаддзелы, якія ўпарта не дасылаюць зводак?

Як-жа можна гаварыць аб апэрацыйным кіраўніцтве папаравай кампаніяй, калі па сутнасьці няма ніякага дакладнага ўліку, калі і да гэтага часу яшчэ невядома, колькі-ж фактычна ўзарана папараў па рэспубліцы.

Нельга цярпець далей такога зусім недапушчальнага становішча. Наркамзем абавязан, нарэшце, не марудзячы далей ні аднаго дня, арганізаваць сапраўдны апэрацыйны ўлік ворыва чыстых папараў.

Але і сёнешняя зводка, хоць яна і далёка няпоўная, дазваляе з поўным правам сказаць, што ворыва папараў па рэспубліцы праходзіць **ДРЭННА, ГАНЕБНА ДРЭННА.** Паводле папярэдніх даных, па 10 чэрвеня ўзарана толькі **36.753** га — **8,8** проц. пляну.

Вазьмеце, напрыклад, **БАБРУЙСКІ** раён. Плян ворыва папараў выканан толькі па 2,9 проц. Раён павінен узараць 7.500 гэктараў. Узаран-ж усяго... 214.

Што гэта, як не рэзультат апартуністычнай недаацэнкі папаравай кампаніі, як не рэзультат дэмабілізацыйных настрояў і стаўкі на самацёк!

З такім становішчам трэба рашуча і пры тым неадкладна пакончыць. Нельга дапусьціць ніякіх адтэрміноваваньняў. Плян ворыва папараў павінен быць выкананы сваячасова і выкананы добра. Сакрушальны адпор найменшым рэцыдывам шкодніцтва, асуджанай партыяй «тэорыі» мелкага ворыва.

Сваячасова і добра, на ўстаноўленую глыбіню ўзараць чыстыя папары — вось у чым задача.

Яна можа і павінна быць выканана ва што-б там ні стала.

Раўняйцеся па перадавых раёнах, якія па-баявому разгарнулі ворыва папараў.

ПАРЫЦКІ раён, напрыклад, ужо шчыльна падыходзіць да поўнага завяршэньня ворыва папараў. Да 10 чэрвеня гэты раён выканаў плян ворыва на 89,2 проц. Добра праводзіць ворыва і **ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА**, якая ўжо выканала больш 50 проц. свайго пляну.

Прыклад гэтых раёнаў — яркі довад, што наша рэспубліка мае абсалютна ўсе магчымасьці ня толькі ў тэрмін, але і значна раней узараць чыстыя папары.

Галоўнае, распачаць цяпер у тым, каб па-бальшавіцку спалучыць ворыва папараў, прапалачныя работы і падрыхтоўку да ўборкі новага ўраджаю. Іменна ў гэтым **АСНОВА АСНОЎ** посьпеху нашай барацьбы за высокую ўраджайнасьць калгасных палёў.

І таму трэба асобна спыніцца на матар'ялах з Мазырскага раёну, якія мы сёньня зьмяшчаем у «Зьвязьдзе».

Гэтыя матар'ялы яркa паказваюць, да чаго прыводзяць дэмабілізацыйныя шкодныя настроі «міжнапар'я», апартуністычныя тэндэнцыі адпачыць пасьля веснавой сяўбы.

Мы не сумняваемся, што Мазырскі райком ухваліў ужо даволі пастаноў і рэзалюцый аб прапалачных работах і падрыхтоўцы да ўборкі. Аднак, відаць, гэтыя пастановы — толькі фармальная адпіска. Палі па Мазыршчыне заглушае пустазельле, а прапалачныя работы ў раёне фактычна зусім не арганізаваны.

Мы заваспраем увагу на мазырскіх фактах таму, што падобны настрой, падобныя адносіны да прапалачных работ значна пашыраны і ў цэлым радзе іншых раёнаў нашай рэспублікі.

Партыйныя арганізацыі абавязаны па справе даць бальшавіцкі адпор усякім праўленьням дэмабілізацыйных настрояў «міжнапар'я». Нельга пакінуць ні аднаго гэктара, засьмечанага пустазельлем.

Райкомы партыі абавязаны забясьпечыць канкрэтнае штодзённае кіраўніцтва і пільны кантроль за ходам і, асабліва, за якасьцю прапалачных работ!

АБ УЗДЫМЕ ПАПАРАЎ І АРГАНІЗАЦЫІ УБОРКІ ЗБОЖЖАВЫХ ПА ПАЎНОЧНЫХ РАЁНАХ

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б)

У дадатак да пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб уздыму папараў і арганізацыі ўборкі збожжавых» ад 24 мая 1933 году ўстанавіць наступны мінімальны плян уздыму чыстых папараў пад азімыя і яравыя культуры па паўночных раёнах (у тысячах гэктар):

КРАЯ І ВОБЛАСЬЦІ	Усяго па ўсіх сэктарох	У тым ліку: Калгасы	З іх: Калгасы аблугг. МТС	З іх: Адна-асобнікі	Саўгасы ўсіх сыстэм	З іх: Наркам саўгасаў	З іх: Наркам зем.
Ленінградзкая	407,0	236,0	55,0	169,1	1,9	0,1	0,4
Заходняя вобл.	700,0	510,0	143,0	177,0	13,0	5,9	3,4
Маскоўская вобл.	880,0	695,0	150,0	150,0	35,0	11,2	9,7
Горкаўскі край	2119,0	1150,0	250,0	960,0	9,0	2,5	4,2
Паўночны край	211,0	180,0	14,0	60,0	1,0	—	0,3
Іванаўская вобл.	493,0	332,0	100,0	150,0	11,0	7,4	3,2
БССР	399,0	200,0	90,0	190,0	9,0	6,2	2,5
Башкірыя	1048,0	735,0	310,0	180,0	133,0	126,4	4,0
Татарыя	1006,0	800,0	360,0	180,0	26,0	15,0	7,4
Уральская вобл.	1773,0	1400,0	690,0	100,0	273,0	255,2	10,0
Сярэдняя Волга	2223,0	1540,0	980,0	200,0	483,0	439,2	38,4
Казакская АССР	905,0	717,0	400,0	6,0	182,0	169,1	2,2
Заходняя Сібір	2011,0	1453,0	788,0	100,0	458,0	421,6	3,4
Усходняя Сібір	872,0	610,0	327,0	135,0	127,0	120,7	2,6

Абавязаць мясцовыя партыйныя і савецкія органы, Наркамзем і Наркамсаўгасаў закончыць ворыва папару не пазьней 25 чэрвеня — па Маскоўскай вобласьці, Ленінградзкай вобласьці, Татарыі, Горкаўскаму краю; 1 ліпеня—па Іванаўскай вобласьці, Заходняй вобласьці, БССР, Сярэдняй Волзе; 10 ліпеня — па Башкірыі і Паўночным краі; 20 ліпеня — па Заходняй Сібіры, Казакстану; 1 жніўня — па Уральскай вобласьці; 10 жніўня — па Ўсходняй Сібіры.

Устанавіць тэрмін касавіцы збожжавых каласавых ва ўсіх калгасах і сэўгасах паўночных раёнаў — 17-20 дзён.

Абавязаць партыйныя і савецкія арганізацыі Ленінградзкай вобласьці, Маскоўскай вобласьці, Заходняй вобласьці, Іванаўскай вобласьці, Татарыі, Паўночнага краю, Горкаўскага краю і БССР забясьпечыць вязку ў снапы ўсяго збожжа.

Уральскай вобласьці, Сярэдняй Волзе, Башкірыі, Заходняй Сібіры, Казакстану — ня менш ⅔ усяго збожжа.

Абавязаць партыйныя і савецкія органы, Наркамзем адабраць і падрыхтаваць да ўборкі па калгасным сэктары:

ВОБЛАСЬЦІ І КРАІ	Камбайнэраў	Штурвальных	Льнацеребільшчыкаў	Машыністаў на складаных малатарні	Работнікаў на сноп-вязалцы
Ленінградзкая вобл.	—	—	1720	700	300
Заходняя вобл.	—	—	2830	600	400
Маскоўская вобл.	—	—	1240	990	900
Горкаўскі край	—	—	1270	685	1500
Паўночны край	—	—	300	50	100
Іванаўская вобл.	—	—	2000	845	400
БССР	—	—	1300	1400	2000
Башкірыя	290	290	—	600	2000
Татарыя	270	270	—	380	500
Уральская вобл.	2000	2000	1270	2000	6500
Сярэдн. Волга	1900	1900	—	3600	8000
Казакская АССР	1100	1100	—	1500	8000
Заходн. Сібір	2300	2300	650	4000	9000
Усходн. Сібір	60	60	45	1260	1600

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР — В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б) — І. СТАЛІН.

14 чэрвеня 1933 г.

ЯК У МАЗЫРЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЎБОРКІ

МАЗЫР. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Толькі 3 чэрвеня мазырскі райземаддзел успомніў аб прапалцы. Сель саветам і калгасам былі пасланы планы прапалачных работ.

Гэта ня ўсё. Зьмест плянаў мазырскага райземаддзелу зьяўляецца даволі скромна кажучы, сваласаблівым. Кіраўнікі райземаддзелу сплянавалі так, што яравыя аказваецца, трэба прапалоць толькі ў лепшым выпадку . . . **НА ПАЛОВУ!?**

Загадчык райземаддзелу тав. Радзівіновіч з зусім незразумелым гонарам заяўляе:

— Мы ў сваіх плянах прадугледзелі, напрыклад, прапалку ня менш як 30 проц. пасеваў ячменю.

Ну і ўстановачка! Дазарыентуюць калгасьнікаў і аднаасобнікаў, скарачаюць пляны прапалачных работ ды яшчэ хваляцца.

Няма чаго дзівіцца, што прапалка на Мазыршчыне праходзіць зусім ДРЭННА.

Зірнеце на палі калгасу імя Варашылава (Бабруйскі сельсавет). Пустазельле глушыць пасевы. Палі значна засьмечаны. Як-жа арганізавана прапалка?

Калгас павінен прапалоць 115 гэктараў. І вось у гэтым калгасе, дзе ёсьць ясьлі, дзе з 86 калгасьнік 84 акуратна выходзяць на работу, за пяць дзён прапалка праведзена на плошчы толькі 4,15 га. Гэта значыць, што ў сярэднім адна калгасьніца прапалвае за дзень 0, 01 га.

Прычыны?

Няма ніякіх норм выпрацоўкі, ніякага ўліку колькасьці і якасьці працы. Працадні налічваюцца так, як уздумаецца брыгадзірам. Ніхто даклад на ня ведае, як будзе ацэньвацца яго работа на прапалцы.

А калі і ўзялася за ўлік, дык дапусьцілі самую агідную ўраўнілаўку. Усім пароўну, за розную работу—адналькавая аплата.

У калгасе імя Варашылава за прапалку на РОЗНЫХ вучастках поля з РОЗНАЙ засьмечанасьцю—адзін і той жа падыход да налічэньня працадзён.

Такое-ж становішча і ў цэлым радзе іншых калгасаў.

Ці ведаюць пра гэта ў мазырскім райземаддзеле. Для адказу падамо пастуную заяву Радзівіновіча:

— Хіба ёсьць у нас магчымасьці ведаць, што робіцца ў калгасах і вёсках раёну?...

Камэнтары не патрэбны.

Панска-сапоўныя мэтады кіраўніцтва, работа па-старарму, цыркулярщына і штампаўшчына—вось што характэрна для мазырскага райземаддзелу.

У раёне яшчэ і цяпер НЕ ЗАСЕЯН поўнасьцю яравы клін. Пры агульным выкананьні пляну заданьні па асобных культурах яшчэ ня выкананы. Даволі ўказаць, што ў раёне на 11 чэрвеня трэба было засеяць яшчэ **300** гэктараў аўса.

Усе ў адзін голас заяўляюць, што ў раёне «больш няма насеньня». І гэта ў той час, калі на мясцовым абменным пункце ляжаць нескарыстанымі звыш **15** цэнтнэраў аўса...

Мазыршчына з 15 чэрвеня павінна была РАЗГАРНУЦЬ уборку заліўных і балотных сенажацяй, а іх у раёне — абсалютная большасьць.

Але і на сёнешні дзень у раёне на ват няма дакладных плянаў уборачных работ. Яўна панае старая дзедаўская традыцыя: «касіць з 15 ліпеня». Самі раённыя работнікі прызнаюць, што гэта так, бездапаможна разводзяць рукамі і горача абяцаюць што-небудзь зрабіць...

— Трэба будзе, — кажа кіраўнік райземаддзелу, — гэтыя традыцыі зламаць.

І так толькі зьбіраюцца яшчэ «ламаць», калі-ж пачнецца сенапаўборка — невядома.

За час сяўбы ў выніку барбарскіх адносін да каня ў раёне сталі нягодным да работы каля 800 коняй. Агіднейшая лічба, якая і цяпер не паслужыла ўрокам для мазырскага раённага кіраўніцтва.

Нельга далей так працаваць. Ад мазырскага раённага кіраўніцтва, у першую чаргу ад РК КП(б)Б патрэбен ясны і вычарпальны адказ, што ім зроблена, каб неадкладна і на справе выправіць гэтыя грубейшыя памылкі.

В. ДАЛЬ.

Бясконцыя пасяджэньні замест апэрацыйнага кіраўніцтва

БЕШАНКОВІЧЫ, 15. (Па тэлефону ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

БЕШАНКОВІЦКІ раён ганебна зацягнуў сяўбу. Да 13 чэрвеня плян сяўбы яравых выкананы толькі на 79,6 проц. На 14 чэрвеня — **81** проц. Прырост за адзін дзень складае такім чынам толькі 1,4 проц. Тэмпы з кожным днём усё больш і больш зьніжаюцца.

У чым прычыны такога становішча? Сакратар раённага камітэту партыі тав. **ЯКАЎЛЕЎ** ляканічна тлумачыць:

— У людзях.

Гэта верна. Трэба толькі дадаць: «у якасьці кіраўніцтва сяўбой з боку РК КП(б)Б і РВК таксама».

Спынімся на Вярхоўскім сельсавеце.

У гэтым сельсавеце горш за ўсіх праводзіць сяўбу самы буйны ў раёне калгас **«БАЛЬШАВІК»**. Ён павінен засеяць больш 2.000 га яравых. Сяўба-ж ганебна сарвана.

Да самага апошняга часу ніхто ў раёне і сельсавеце не паклапаціўся выявіць, дзе прычыны такога злачынага адставаньня ў сяўбе.

Толькі тры дні назад партыйная ячэйка, дый то па ініцыятыве ўпаўнаважанага ЦК тав. Мамаева, выявіла, што на чале калгасу стаіць клясавы вораг, кулацкі агент Курмель, які нейкім чынам трапіў у партыю.

Гэты Курмель ужо разбурыў ушчэнт адзін калгас у раёне. Але яго міласьліва пакінулі ў партыі. З ведама раённага камітэту партыі Курмель прызначаецца старшынёй буйнейшага калгасу «Бальшавік».

Аказваецца Курмень, будучы ў калгасе, меў уласны хутар па-за калгасам. На вачох сельсавецкага і раённага кіраўніцтва ён у першую чаргу засеяў уласную зямлю на сваім хутары, выкарыстаўшы калгасную цягавую сілу.

У Бешанковіцкім раёне 65 проц. аднаасобнікаў. Сярод іх не праводзіцца ніякай масава-растлумачальнай і арганізатарскай работы. Многія гаспадаркам яшчэ і цяпер ня ўручаны абавязацельствы па цьвёрдых пастаўках збожжа. Новы закон аб пастаўцы збожжа і іншых с.-г. прадуктаў дзяржаве не растлумачан.

Усім гэтым карыстаецца клясавы вораг, які шалёна разгортвае сваю агітацыю сярод аднаасобнікаў.

А раённыя арганізацыі па-ранейшаму нічога, так сказаць, ня бачаць. Улюбёны мэтад работы ў раёне — доўгія бясконцыя сходы, пасяджэньні да сьвітаньня. Гэта характэрна і для раённых арганізацый, і для сельсаветаў. 14 чэрвеня, напрыклад, у Вярхоўскім сельсавеце пленум адбываўся да 4-х гадзін раніцы. Сядзелі, гаварылі, пераліваді з пустога ў парожняе — і толькі, калі пачало сьвітаць, разышліся.

А пакуль адбываюцца гэтыя бескарысныя пасяджэньні і доўгія сходы, кулак па-свойму апрацоўвае аднаасобнікаў ды калгасьнікаў у хатах, на полі, у баразьне.

Так у Бешанковічах, з дазволу сказаць, змагаюцца за сяўбу. Німа чаго дзівіцца, што прапалка і ворыва папараў у раёне амаль зусім не разгорнута. Пустазельле пачынае глушыць і без таго спозьненыя пасевы.

А. МІКУЦКІ.

УДАРНІКІ ВОРЫВА ПАПАРАЎ

МАГІЛЕЎ. (БЕЛТА).

Гарадзішчанскі сельсавет па-баявому разгарнуў папаравую кампанію.

Плян ворыва чыстых папараў па калгасах **ПЕРАВЫКАНАН.** Замест **210** гэктараў паводле заданьня ўзарана **245** га.

Ворыва папараў скончана да 10 чэрвеня. У сельсавеце адбыўся вылёт калгасьнікаў-ударнікаў, які абавязаўся сваячасова і без страт убраць ураджай.

ЧАШНІКІ. (Па тэлеграфу).

Саўгас Пачаевічы, які ўвесь час адставаў, дабіўся ня толькі поўнага выкананьня пляну па сяўбе яравых, але і скончыў ворыва чыстых папараў.

Засеяна замест 331 га 333 гэктараў. **УСЕ НАЯЎНЫЯ ПАПАРЫ ЎЗАРАНЫ.** Плян здачы таварнай прадукцыі за першае поўгодзьдзе выканан поўнасьцю. Рыхтуемся да ўборкі новага ўраджаю.

ВЫКЛІКАЕМ ШКЛОЎ

ЧАВУСЫ. (Па тэлеграфу).

Калгасьніцы і аднаасобніцы—бяднячкі і сераднячкі, сабраўшыся на свой раённы зьлёт, выклікаюць калгасьніц і працоўных аднаасобніц Шклоўскага раёну на сацыялістычнае спаборніцтва за першынства ва ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве.

Асноўныя паказальнікі спаборніцтва —сваячасовае і высокакаяснае правядзеньне прапалкі, хуткая, бяз страт уборка ўраджаю і датэрміновае выкананьне абавязацельстваў па пастаўцы збожжа і іншых с.-г. прадуктаў.

Чакаем вашага адказу.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЛЕТУ.

САНІ ДЛЯ... КАСЬБЫ

РАГАЧОЎ, 15. (БЕЛТА).

Плян завозу ўборачных машын у раён выкананы толькі на 40 проц. Зусім не завезены запасныя часткі да сенакасілак і жнівярак.

Затое райкантора Белсельгасснабу ўмудрылася завезьці ў раён вілы для зграбаньня коксу (?). Завозіцца таксама шмат саней.

Галавацянства, якое мяжуецца з простым злачынствам. Райкантора з абураючай безадказнасьцю адносіцца да такой важнай справы, як завоз уборачных машын. Чаго варта хоць-бы тое, што загадчык канторы Шандаровіч цяпер, у самы разгар падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, кінуў усё і паехаў у адпачынак.

ЗЛАЧЫННАЯ ЦЕГАНІНА

Загадчык Бабруйскай канторы Белсельгасснабу тав. **Дамброўскі** і дырэктар Бабруйскага машына-рамонтнага заводу імя Варашылава тав. Бобкін заключылі дагавор па выраб утулак для жнівярак.

Згодна дагавору завод абавязан быў да 1-га чэрвеня выпусьціць **5 тыс. утулак,** за што атрымаць ад канторы **19 тысяч 750 рубл.** (па тры рублі 95 кап. за кожную ўтулку).

Пра дагавор успомнілі тады, калі падыйшла рамонтная кампанія, калі калгасы і саўгасы пачалі патрабаваць ад канторы Белсельгасснабу ўтулкі для жнівярак.

І дагавор, які падпісаў некалі сам Дамброўскі, цяпер зьдзівіў яго. Бо ці-ж можна плаціць за ўтулку 3 рублі 95 кап., калі згодна прэйскуранту яна каштуе ўсяго толькі **30 кап.**

Справа нават дайшла да таго, што Дамброўскі адмовіўся плаціць за выраб і **Карпенка** загадаў спыніць выпрацоўку ўтулак.

500 утулак, якія патрэбны для рамонту жнівярак, ляжаць на складзе заводу, а **«гаспадары»** спрачаюцца.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Выпраўленьне па-хаду недахопаў першых дзён чысткі —задача праверкомаў і ўсей партарганізацыі

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА АРШАНСКАЙ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

ВОРША. (Наш кар.)

Масавая чыстка партыі ў Аршанскім раёне пачалася 15-га чэрвеня. З чым-жа сустракае партыйная арганізацыя Аршаншчыны чыстку сваіх радоў? Ужо той факт, што раён апынуўся ў глыбокім тыле на фронце пасеўнай, што плян веснавой сяўбы ў раёне на 10 чэрвеня выканан менш як на 95 проц., — ужо гэты факт дае права сказаць, што партыйная арганізацыя Аршаншчыны не вяла бальшавіцкай барацьбы за выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых перад намі партыяй і ўрадам.

Хіба-ж адставаньне ў сяўбе ёсьць рэзультат нейкіх «спецыфічных» умоў раёну або іншых якіх «аб'ектыўных прычын»? Ясна, што «аб'ектыўныя прычыны» ні прычым, што корань зла ў рабоце партыйных ячэек і сельсаветаў. Прычыны ў тым, што **ў пераважнай большасьці ячэек мелі месца недысцыплінаванасьць, дробна-буржуазная распушчанасьць, патураньне кулацка-дзедаўскім традыцыям.** Гэта асабліва выразна падкрэсьліў у гутарцы з карэспандэнтам «Зьвязды» старшыня раённай камісіі на чыстцы т. **Турлай.**

1 сапраўды. Кіруючыя партыйныя і савецкія работнікі **Баранскага** сельсавету (Кірыкоўскі, Савіцкі, Вабінэр) адкрыта выступалі супроць раньняй сяўбы. Пры наяўнасьці сухой падрыхтаванай глебы пасылалі трактары на нізіны, тапілі ў грязі, абы толькі абараніць кулацкую стаўку — сеяць пад «духа», сарваць бальшавіцкую сяўбу. Гэтыя кулацкія агенты атрымалі на заслугах. Аднак, належных вывадаў астатнія ячэйкі, асабліва адстаючых сельсаветаў, не зрабілі. Больш таго. Калі прыступіў да працы новы сакратар РК КП(б)Б т. **Соснін** і пачаў пераносіць у работу аршанскіх арганізацый мэтады чырвонасьцяжнага **Спуцкага** раёну, пасобныя кіруючыя пізаўны і нават раённыя работнікі (**Прыгожын, Куксевіч**) аказалі гэтаму яўнае супраціўленьне. На першай нарадзе актыву, праведзенай т. Сосніным, выступіў новы сакратар **Баранскай** ячэйкі тав. **Кавалёў.** Ён расказаў, як на аснове работы на - новаму, на аснове барацьбы з кулацкім сабатажам у Баранскім сельсавеце літаральна за 2-3 дні быў зроблен пералом — выкананы плян веснавой сяўбы. Тады-ж тав. Кавалёў выклікаў на спаборніцтва ячэйкі адстаючых сельсаветаў, заклікаў улічыць урокі Барані.

— Ты нас не агітуй,—адказваў на заклік **Прыгожын.**

— А калі ты сваё нам дасі?—утаропіў яму **Куксевіч.**

Так сустрэлі выклік на спаборніцтва апартуністы з партбілетамі ў кішэні. Толькі махровай праваапартуністычнай практыкай можна вытлумачыць тое, што **Будаўскі** сельсавет (старшыня сельсавету **Градзюшка**, сакратар ячэйкі **Шастоўскі**) плян веснавой сяўбы да 11 чэрвеня выканаў толькі на 77 проц., **Малятнянскі** (старшыня сельсавету **Кітаеў**, сакратар ячэйкі **Прыгожын**)—88,3 проц., **Яканлевіцкі (Шурынаў, Цыпін)**—84 і т. д.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што пералому няма да гэтага часу, што **тэлеграма т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА Аршанскаму раёну радам ячэек ігнаравала ся,** што падрыхтоўка да чысткі партыі ня была ўвязана з мабілізацыяй партыйнай арганізацыі і наогул працоўных мас на барацьбу за тэмпы і якасьць сяўбы.

Фармальнасьць, чыноўніцкі падыход да чысткі партыі — асноўныя аднакі ў рабоце значнай часткі партыйных ячэек як гораду, так і вёскі. У радзе ячэек (**ільнакамбінат** і інш.) падрыхтоўка да чысткі заключалася ў тым, што вывесілі пару абвестак, праведзен далёка нецматлюдны сход, на якім быў заслуханы даклад — паток агульных «прытожных» фраз і слоў. А большасьць рабочых камбінату ня быў азнаёмлены ня толькі з задачамі чысткі, але наогул ня ведалі аб тым, што будзе чыстка і каго будуць чысьціць.

Такое-ж становішча і ў радзе вясковых ячэек напр., (Якаўдевічы).

Далёка нездавальняюча пастаўлена работа ў **каапэрацыйных** арганізацыях. За апошні год па горадзе мае месца зьніжэньне гандлёвага звароту, буйнейшыя растраты, што значна адбілася на рабочым снабжэньні. Значныя прарывы ёсьць і ў выкананьні прамфінпляну. А між тым за нярыд падрыхтоўкі да чысткі пералому і зрухаў наперад няма.

Чыстка, як магутны сродак умацаваньня партыйных радоў, мабілізацыі шырокіх працоўных мас і ў першую чаргу камуністаў на барацьбу за тэмпы і якасьць сацыялістычнага будаўніцтва, як магутны сродак навучэньня класава-ідэалягічнай свядомасьці і ўстойлівасьці кожнага члена і кандыдата партыі,—у Аршанскім раёне была недазрэлена. У буйнейшых прадпрыемствах раёну (парткалектыў цэхі, інтэрнаты, хлебазавод) на сходах, прысвечаных чысткі партыі, прысутнічала ня больш 50 проц. камуністаў, не таварачы ўжо пра беспартыйных рабочых.

Недаацэнка падрыхтоўчай работы да чысткі мела месца ня толькі ў парткалектывах і ячэйках. Гэта-ж можна сказаць і аб **райкоме** і асабліва аб **райКК.** Прывядзем толькі адзін факт. Да падбору кандыдатур у ячэйковыя праверкомы, Аршанская райКК падшыла надзвычай павярхоўна. Кандыдатуры ня былі абгаворваны на аб'яднаным пасяджэньні бюро РК і прэзыдыуму РКК. РайКК чамусь ці сама захацела зрабіць гэту работу, прычым зрабіла на меншай меры бездказна. Кандыдатуры ў ячэйковыя праверкомы выбіраліся па вучотных картках, улічваючы толькі парагстаж. У рэзультаце такога фармальна-бюракратычнага падыходу ў лік кандыдатур у ячэйковыя праверкомы райКК раіла людзей, якія мелі па некалькі вымоў, якія ў самыя цяжкія часы падпольнай работы дэзэртыравалі з партыі і толькі ў часы нэпу вярталіся назад (Царэвіч). Больш таго. Раіліся... «мёртвыя душы» (Гарэлік), якіх ужо даўно няма ў арганізацыі.

Гэтыя памылкі былі выкрыты і выпраўлены раённай камісіяй па чыстцы, якая за некалькі дзён правяла ўжо значную арганізацыйную і масавую работу ў раёне. Праведзены агульна-гарадскі сход камуністаў і сход на чыгуначным вузле, нарада сакратароў ячэек, зьлёт работнікаў нізавога друку і т. д. Арганізавана 5 ячэйковых праверкомаў, у якія ўвашлі адданыя, устойлівыя ленінцы.

Чыстка пачалася. Аднак, гэта ня значыць, што падрыхтоўчая работа закончана. Там, дзе чыстка будзе праходзіць пазьней, партыйныя арганізацыі павінны пачаць прапушчаны час, сустрэць праверку сваіх радоў ударнай работай на выторнасьці, сустрэць палітычна-пісьменным, узброеным тэорыяй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна.

Віт. Даль.

МАНЭЎР ВОРАГА НЯ ЎДАЎСЯ

4-ты дзень праводзіцца чыстка партарганізацыі фабрыкі «**Настрычнік**» (Менск).

Ня глядзячы на тое, што чыстка праходзіць пры актыўным удзеле ўсяго рабочага калектыву фабрыкі, самакрытыка яшчэ ня ўзьнята на належны палітычны ўзровень. Выступленьні аднабокія. Выступаючыя таварышы больш застанаўліваюцца на ад моўных бакох таго ці іншага камуніста, не паказваюць яго дадатных бакоў, на чым можна было-б вучыцца іншым.

11 чэрвеня, напрыклад, праводзілася чыстка ячэйкі т. **Сьверліна.** Чыстку праходзіў член партыі з 1931 г., т. **Сытун.** Сытун працуе на гофманскім прэсе і заўсёды дае дзенную якасьць. За гэта тав. Сытун ад партыі атрымаў спагнаньне. Тав. Сытун адмовіўся ад удзелу ў сацпанаборніцтве і ўдарніцтве і ня выконвае грамадзкія нагрузкі.

Выступае тав. **Столяр** і замест таго, каб па-бальшавіцку паказваць на мылкі Сытуна, падышоў да справы «па-сямейнаму», так сказаць, Сытун «свой хлопец», трэба пашкадаваць...

Чыстка партыі ў гэтыя дні паказала, што партарганізацыя фабрыкі «Бастрычнік» дрэнна займалася павышэньнем палітычнага ўзроўню і авангардной ролі камуністаў, сыстэматычнай работы сярод кандыдатаў і членаў партыі ў гэтым напрамку не праводзілася. У выніку большасьць членаў і кандыдатаў партыі ячэйкі 1-апрагату першай зьмены і ячэйкі 1-ка аграгату другой зьмены, аказаліся палітычна малапісьменнымі.

Рад парторгаў і кіруючых работнікаў арганізацыі не змаглі адказаць на самыя элементарныя пытаньні. Парторг 11 лепты тав. **Файвішаў** на пытаньне, чаму нашай дзяржаве неабходна было выдаць закон аб ахове грамадзкай маёмасьці—ня змог адказаць.

Член партыі тав. **Сытун** на пытаньне, у якім годзе арганізавалася наша партыя, адказаў, што ў 28 годзе. Член партыі з 27 году тав. **Дорцін,** які працуе вагонрацаўніком на фабрыцы; на пытаньне, чаму мы вядзем такую рашучую барацьбу з ураўнілаўкай, адказаў, што яму па гэта пытаньне адказаць «цяжка». Тав. **Штэйнман,** які ўжо 2½ гады зьяўляецца кандыдатам партыі, ня ведае статуту партыі. Адказны сакратар фабкому тав. **Мардуховіч,** член партыі з 1932 году, на пытаньне аб ролі прафсаюзу ў час і ў капіталістычных краінах таксама ня мог адказаць.

Такіх прыкладаў можна было-б пры весьці шмат. Цікава адзначыць, што ў характарыстыцы кожнага камуніста адзначана — «палітычна падрыхтаван здавальняюча».

***

12 чэрвеня камісія праверыла члена партыі з 28 году тав. **Чарнаморца.** Ён коратка застанаўліваецца на сваім жыцьцяпісе.

Пасьля яго кароткай прамовы з месца падымаецца **Левін Б.** (былы сыяніст, які за нядобраякасную працуючую атрымаў вымову і 11 чэрвеня за тое, што затрымаў ленту, інструктарам быў зьнят з работы), з пытаньнем—рэплікай: «колькі шкур у рабочага». Адразу зала напоўнілася говарам. З усіх канцоў залі падымаліся камуністы і беспартыйныя з просьбай у старшыні праверкому слова. Першае слова атрымаў т. Гінзбург.

— Таварышы, выступленьне Левіна Б. трэба ахарактарызаваць, як яўна контр-рэвалюцыйнае.

...Заля авацыямі сустрэла першыя словы Гінзбурга.

Гінзбург тавярыў далей:

— Яшчэ такога лодыра, зрыўшчыка прамфінпляну, як Левін Б., на фабрыцы ня знойдзецца. А тав. Чарнаморац—лепшы камуніст, лепшы майстар па фабрыцы і па-мойму Левін Б. хацеў скампрамэтаваць нашага лепшага камуніста.

Пасьля Гінзбурга яшчэ выступаў рад камуністаў і беспартыйных рабочых, якія таксама ахарактарызавалі выступленьне Левіна Б. як контррэвалюцыйнае. Левін хацеў скампрамэтаваць лепшага камуніста, лепшага адданага майстра цэху.

Тое, што лепшыя водзывы аб Чарнаморцы сустракаліся авацыямі, гаворыць аб тым, што Чарнаморац зьяўляецца адным з лепшых камуністаў, адным з адданых майстраў нашых сацыялістычных прадпрыемстваў.

Манэўр сыяніста, лодыра, ворага ня ўдаўся. Камуністы разам з беспартыйнымі рабочымі далі яму адпор.

Есьман.

ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯМА

Кіраўніцтва партыйнай арганізацыі вагона-рамонтнага заводу імя **Мясьнікова** (Менск) не спалучыла чыстку сваіх радоў з мабілізацыяй рабочых на барацьбу за выкананьне прамфінпляну.

Завод цэлы час ня выходзіць з прарыву. З пачатку 1933 г. плян выконваецца ня больш як на 90 проц. У першай дэкадзе чэрвеня прарыў ягчэ больш паглыбіўся: асноўны цэх заводу—пасажырскі асвоіў праграму першай дэкады чэрвеня ўсяго толькі на 37 проц.

Асноўная прычына адставаньня заводу—самацёк у рабоце. Ні адзін цэх ня мае абгрунтаванай праграмы нават на пяцідзённку, або на дэкаду. Дырэкцыя кіруе заводам з габінету. Культурна-выхаваўчая і партыйна-масавая работа—самы адсталы участак.

Праваліўшы падрыхтоўчую работу да чысткі, кіраўніцтва партыйнага калектыву на чале з тав. **Шлёміным** ня здолела яшчэ і зараз перабудаваць па-хаду, каб навярстаць упушчанае.

На заводзе ўжо 5 дзён праходзіць індывідуальная праверка камуністаў. Рэзультаты гэтых пяці дзён выклікаюць біль трывогу. Большасьць членаў і кандыдатаў партыі прыйшлі на чыстку палітычна пісьменнымі, не арыентуюцца ў асноўных пытаньнях бягучай палітыкі, ня чытаюць газэт, ня ведаюць статуту і праграмы партыі.

Для праходжэньня чысткі на трыбуну ўзыходзіць работы **Абрамсон**—член партыі з 1925 г. Тав. Абрамсон на заводзе працуе малярам. Колькасным і якасным паказальнікамі выканаўня пляну ён пахваліцца ня можа, яго працу вельмі часта перарабляюць. Партыйная нагрузкі ніякай ня мае, партыяцыцём ня цікавіцца. Не наведвае партыйнай вучобы.

— Сорам нам, таварышы, што ў нашай ячэйцы член партыі з 1925 году стаіць на галаву ніжэй за ўсіх адносінах за некаторых беспартыйных рабочых заводу—адзначыла ў сваім выступленьні тав. **Белкевуская.**

Прайшоўшы чыстку тав. **Іваноў** у партыі з 1927 году, на заводзе з 1928 г. На выторчасьці ён перадавы рабочы, але нізкі палітычны ўзровень не дазваляе яму быць сапраўдным, стойкім змагаром за генэральную лінію партыі. Адпойны па сходзе ячэйкі КП(б)Б пасажырскага цэху тав. Іваноў сьцьвярджае, што недахоп хлеба ў СССР адчуваецца таму, што праводзіцца індустрыялізацыя краіны, і да таго часу будзе адчувацца не дахоп, пакуль будуць ствараць калгасы...

Ні цэхавая партыйная ячэйка, ні бюро калектыву не растлумачылі Іванову шкодлівасьць такіх «установак», не зьвярнулі на гэта ніякай увагі. Таму ня дзіва, што на самым простым запытаньні палітычнага зьместу Іваноў увесь час даваў адказ: ня ведаю.

На чыстцы высьветлілася, што «камуніст» **Селіцкі**—былы меншавік. У 1931 годзе, карыстаючыся партыйнай сьлепатой бюро парт'ячэйкі і калектыву заводу, Селіцкі сфальсіфікаваў у рады камуністаў. Ад сваіх меншавіцкіх поглядаў Селіцкі не адмовіўся. Ня так даўно ён даказаў рабочым пасажырскага цэху, што праграма камуністычнай партыі ... перабудоўваецца зараз на ўзор праграмы партыі меншавікоў. Гэта праціва міма ўвагі бюро партыйнага калектыву. Зараз Селіцкі зьяўляецца трыбунам у пасажырскім цэху. Можна сабе ўявіць ідэйны зьмест палітыка-выхаваўчай работы ў групе Селіцкага. Брат Селіцкага за падрыўную работу на заводзе выслан за межы БССР. Браты трымаюць памяж сабой цесную сувязь.

На чыстцы высьветлілася, што партыйная дысцыпліна сярод камуністаў нізкая. Член партыі з 1931 году **Пасьбед Мікола** ня ахіціць членскіх узносаў зашы году, **Шабалінскі Міхась**—член КП(б)Б з 1924 году—на чыстку 6 месяцаў і калі 4-х камуністаў—на 3-4 месяцы.

Чыстка высьветліла, што бюро калектыву не прыцягнула да актыўнай партыйнай работы старых камуністаў, не наладзіла работы па выхаваньні навічкоў, не забясьпечыла падрыўнай вучобы на заводзе. Гэта імена і прывяло да правалу ўсёй партыйнай работы.

Зусім нездавальняючым трэба прызнаць удзел у чыстцы партарганізацыі заводу беспартыйных рабочых, якіх на сходах бывае ў сярэднім ня больш 30-35 проц. Беспартыйныя рабочыя амаль не выступаюць з крытыкай работы асобных камуністаў. На сходзе выступае ня больш 10-15 чалавек.

М. НІКІЦІН.

РЭЗКАЕ АБВАСТРЭНЬНЕ АЎСТРА-ГЕРМАНСКАГА КАНФЛІКТУ
АЎСТРЫЙСКІ ЎРАД ПАГРАЖАЕ ГЕРМАНІІ ГАСПАДАРЧЫМІ РЭПРЭСІЯМІ

ВЕНА, 14 (Белта). Газэты публікуюць наступную заяву аўстрыйскага міністра ўнутраных спраў ШУМІ з прычыны арышту аўстрыйскімі ўладамі кіраўніка нацыянал-сацыялістаў у Аўстрыі, германскага грамадзяніна ГАБІХТА: «Дзеі насьць Габіхта ў Аўстрыі была бесспарапынным умяшаньнем ва ўнутры-палітычныя справы Аўстрыі. Можна было-б даказаць, што шматлікія меры супроць Аўстрыі былі ўжыты па ініцыятыве Габіхта. Вось чаму зусім зразумела, калі ў сувязі з апошнімі тэрарыстычнымі актамі ў адносінах Габіхта былі зроблены поўныя вывады, якія поўнасьцю апраўдваюць яго арышт».

ШУМІ рэзка пагражае германскаму ўраду гаспадарчымі рэпрэсіямі. Сёньня чакаецца высылка Габіхта ў Германію.

У колах хэймвэру сьцьвярджаюць, што аўстрыйскі ўрад абмяркоўвае пытаньне аб адкліканьні АЎСТРЫЙСКАГА ПАСЛАНЬНІКА З БЭРЛІНУ і перадачы абароны аўстрыйскіх інтарэсаў ПАСЛУ АНГЛІІ. Трывожнасьць становішча ў ВЕНЕ ўзмацнілецца чутнямі аб канцэнтрацыі атрадаў германскіх нацыянал-сацыялістскіх штурмавікоў пры Аўстрыйскай граніцы.

Арышт суправоўніка аўстрыйскага пасольства ў Бэрліне

БЭРЛІН, 15 (Белта). Арыштован загадчык аддзелу друку аўстрыйскага пасольства ў БЭРЛІНЕ ВАССЭРБЭК. Не падлягае сумненьню, што арышт Вассэрбэка зьяўляецца адказам германскага ўраду на арышт кіраўніка аўстрыйскай нацыянал-сацыялістскай партыі ГАБІХТА, які адначасна займаў пост загадчыка бюро друку германскага пасольства.

Згодна паведамленьня «Вольфа» германскія ўлады пастанавілі высылаць Вассэрбэка з Германіі. Заўтра ён пакідае Германію.

Польшча мае намер не плаціць чарговага ўзносу па даўгох

ВАРШАВА, 14. (Белта). Польскі пасол у ПАЗШ **Патэк** уручыў амэрыканскаму ўраду мэмарандум аб польскім кансалідаваным даўгу ПАЗШ. У мэмарандуме канстатуецца, што становішча Польшчы, апісанае ў ноце ад 8-га сьнежня 1932 г., не зьмянілася. Вось чаму польскі ўрад прапануе адтэрміноваць плацёж ад 15-га чэрвеня і заяўляе, што гатоў абмеркаваць сумесна з урадам ПАЗШ пытаньне аб указаным даўгу.

Жорсткія прысуды за распаўсюджваньне „Ротэ Фанэ"

БЭРЛІН, 14 (Белта). За папырэньне нелегальнай камуністычнай газэты «**Ротэ Фанэ**» надзвычайны суд прыгаварыў двух беспрацоўных—аднаго да паўтара год турэмнага зьняволеньня, а другога да аднаго году і трох месяцаў турмы. Надзвычайны суд у **Дармштаце** прыгаварыў адну 16 гадовую дзяўчыну да 8 месяцаў турэмнага зьняволеньня і 16 гадовага хлопчыка да 5 месяцаў турэмнага зьняволеньня за тое, што яны напісалі і папыралі камсамольскую адозву. На справе 4-х рабочых, якія абвінавачваліся ва ўдзеле ў сутычцы, у часе якой быў забіт нацыянал-сацыялісцкі штурмавік, **Бэрлінскі** суд вынес наступны прыгавор: 27-гадовага рабочага **Шэля**—да 15 год катаржных работ, 19 гадовага рабочага **Бэльфуса** да 10 год турмы і двух рабочых да 6 год катаржных работ кожнага.

У **Алене** (Вестфалія) паліцыя за апошнія дні арыштавала 100 чалавек, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці. У арыштаваных нібыта знойдзена 13 цэнтнэраў камуністычнай літаратуры. У **Гельзэнкірхэне** арыштавана 8 чалавек, якія абвінавачваюцца ў камуністычнай дзейнасьці. У **Боттропе** арыштавана 9 камуністаў.

З лёнданскай канфэрэнцыі

Савецкі праект рэзалюцыі ў фінансавай камісіі

ЛЁНДАН, 14 (ТАСС). Сёньня савецкая делегацыя на сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі ўносіць наступны праект рэзалюцыі ў фінансавую камісію:

«**Урады, прадстаўленыя на данай эканамічнай канфэрэнцыі, маючы на ўвазе мэты, якія ставяць сабе рэзалюцыя арганізацыйнага камітэту ад 12 мая г. г. аб эканамічным перамір'і і імкнучыся да максымальнага поўнага забесьпячэньня эфэктыўнасьці гэтага перамір'я, згаджаюцца спасавацца ўзаемна, незалежна ад прычын іх устанаўленьня, уса ўведзеныя імі рамеі і дзейнічаючыя зараз заканадаўчыя і адміністрацыйныя мерапрыемствы, маючыя характар эканамічнай агрэсіі і дыскрымінацыі, як-та: спэцыяльныя мытныя зборы, устаноўленыя для тавараў, якія паходзяць з якой-небудзь адной краіны, забарону або асаблівыя ўмовы ўвозу і вывазу з якой-небудзь краіны ў краіну і баяйкот гандлю з якой-небудзь краінай».**

Англія ўстрымліваецца ад публічнага выступленьня супроць ПАЗШ

ЛЁНДАН, 14. (БЕЛТА). Сёньня на канфэрэнцыі пасьля абмеркаваньня бэльгійскага дэлегата ГІМАНСА таварышом старшыні канфэрэнцыі першым аратарам выступіў прадстаўнік Аўстрыі ДОЛЬФУС. Прамова апошняга была выслухана з асаблівай увагай, з прычыны таго, што раніцай газэты пашырылі паведамленьне з Бэрліну аб новым абвастрэньні аўстра-германскіх адносін. Некаторыя водгукі гэтага абвастрэньня меліся ў прамове ДОЛЬФУСА.

Прамова НЭВІЛЯ ЧЭМБЭРЛЕНА, натуральна, прыцягнула ўсеагульную увагу, бо ўсе стараліся ў ёй знайсьці хоць бы намёкі на стан уса яшчэ незакончаных перагавораў адносна чэрвенскіх плацяжоў па ваенных даўгох. У гэтых адносінах прамова Чэмбэрлена прынесла расчараваньне. Канкретныя прапановы прадстаўніка Англіі былі паўтарэньнем даўно вядомых англійскіх тэзісаў па пытаньнях эканамічнай палітыкі.

Пасьля першынству выступіў амэрыканскі міністар замежных спраў ХЭЛЛ. Яго прамова, якая чакалася з нецярплівасьцю, адзначалася яўным антынгельскім характарам. Асабліва гэта кідалася ў вочы, калі Хэлл, рысуючы эмоцыны малюнак вынікаў эканамічнага нацыяналізму, прывёў узяты з лёнданскіх вуліц прыклад прапаганды на карысьць пакупкі сваіх тавараў.

Далей Хэлл заклінаў усе краіны далучыцца да тарыфнага перамір'я.

Пасьля Хэлла выступіў з вялікай прамовай тав. ЛІТВІНАЎ.

(ПРАМОВУ ТАВ. ЛІТВІНАВА ПАДАЕМ НА 4 СТАРОНЦЫ).

І. А. Лычоў

ПЕРШЫЯ ЎРОКІ

Чыстка партыі пачалася. Партарганізацыі Беларусі практычна прыступіла да ажыцьцяўленьня пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб генэральнай чыстцы. Чысткай узяо ахоплена 29 раёнаў, у тым ліку ўсе гарады. Агульная колькасьць членаў і кандыдатаў партыі ў гэтых гарадох і раёнах — 48.100 чал., або 74 проц. усёй КП(б)Б.

Чыстка тольні разгарнулася, і рабіць вывады яшчэ заўчасна. Аднак, на падставе падрыхтоўчай работы да чысткі, работы на падборы праверкомаў і першых крокаў чысткі—ёсьць рад пытаньняў, якім патрабуюць свайго асьвятленьня і вырашэньня.

Перш за ўсё аб тых, каму партыя даверыла справу чысткі. З 83 чалавек, што ўваходзяць у раённыя камісіі па чыстцы, па партстажы: з 1904 г.—1 чал., 1905 г. — 1 чал., 1906 г. — 1 чал., 1907 г. — 1 чал., 1909 г. — 1 чал., 1911 г. — 1 чал., 1912 г. — 2 чал., 1916 г. — 3 чал., 1917 г. — 12 чал., 1918 г. — 14 чал., 1919 г. — 21 чал., 1920 г. — 12 чал., 1921 г. — 4 чал. 1922 г. — 1 чал., 1924 г.—9 чал., 1925 г.—4 чал. Рабочых — 67, сялян — 3, служачых—18. На займаемай рабоце: партработнікаў—47, на прафрабоце—5 чал., савецкай—6, гаспадарчай—4, рабочых з вытворчасьці—11чал., на іншых работах—15 чал. Членаў ЦК—10 чал., членаў ЦКК—27 чал.

Раённых работнікаў, працуючых у тых раёнах, дзе праводзіцца чыстка, у склад райправеркомаў уведзена 28 чал. (з 83), астатнія не зьяўляюцца мясцовымі работнікамі, а прызначаны з іншых арганізацый, у тым ліку ўсе старшыні райкамісій. Такім чынам склад праверкомаў з гэтага боку не падпадае ўсякім мясцовым уплывам.

Ячэйковых камісій арганізавана 68. З 63 старшынь ячэйковых камісій з пазпольным партстажам 9 чал., з 1917 г. —13 ч., 1918 г.—9 ч., 1919 г.—16 ч., 1920 г. — 6 ч., 1921 г. — 7 ч., 1922 г. — 1 ч., 1923 г. 1 ч., 1924 г. — 3 ч., 1925 г. — 2 ч., 1926 г. — 1 ч. Рабочых —35, сялян—4, служачых—9.

Ужо тольні гэтыя лічбы гавораць аб многім. Да гэтага трэба дадаць асноўнае, што вылучаныя ў праверкомы таварышы на справе даказалі сваю адданасьць і вернасьць генэральнай лініі партыі, многія з іх прайшлі суровую школу актыўнымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны, сапраўдным будаўнікамі сацыялістычнага грамадзтва. Праверачныя сходы, на якіх гэтыя таварышы праходзілі чыстку і расказвалі аб сваёй барацьбе і рабоце, зьявіліся наглядным паказам асабліва для маладых партыйцаў, якім павінен быць член партыі, як ён павінен працаваць.

Аднак, падбор рабочых і ячэйковых камісій не зьявіўся такой лёгкай і простай справай, як гэта можа некаторым здацца. Тут мы сустрэліся з ня сусім сур'ёзнымі адносінамі асобных партыйных камітэтаў да рэкамэндацый кандыдатур у склад праверкомаў. Даволі прыведзім прыклад з **Гомелю**, дзе ў склад праверкомаў рэкамэндаваліся член партыі **Статкевіч** (завод імя Лапцуцкага), выпадкова ў партыі ў 1922 годзе, калі яго мабілізавалі на фронт па барацьбе з бандытызмам, а потым сноў уступіўшы ў партыю ў 1924 годзе, і член партыі **Грыбанаў** (дэпо Гомель) былы меншавік з 1906 па 1909 г.

У Менску ячэйка **Дзяржпляну** рэкамэндавала ў праверком члена партыі **Панкове,** які в фармальнага боку (член партыі з 1918 г.) як быццам і падыходзіў-бы ў склад праверкому, але калі рэспубліканская камісія падышла глыбей, прыцледзелася да яго, дык аказалася, што гэты таварыш ня мае ніякіх заслуг перад партыяй, якія-б давалі яму права чысьціць другіх. Гэтыя прыклады яшчэ раз гавораць, як памылкова было-б падыходзіць да падбору праверкомаў толькі з фармальнага боку. Заходзячы патрабаваньні аб парртстажы і інш., **галоўнае яшчэ заключаецца ў тым, ці здолеў даны член праверкому забясьпечыць правільнае праведзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з партыі подзей, не апраўдваючых высокай назвы члена партыі, згодна 6 умоў з другога разьдзелу пастановы аб чыстцы, а таксама беспамылковы перавод у кандыдаты і спачуваючыя асоб, якія ня ўсвоілі самых элементарных палітведаў.**

Як паказалі праверачныя сходы, партыйная маса і беспартыйныя вельмі ўважліва, з разуменьнем усёй сур'ёзнасьці і адказнасьці адносіліся да справы чысткі тых, хто намячаецца ў праверкомы, дапамагаючы ў гэтым рэспубліканскай камісіі.

Тыпнная рабочая цэхавая № 1-2 алхіміі кандыдатуру т. **Рудзь** у праверком, бо ён, зьяўляючыся нам. дырэктара керамічнага трэсту, не дапамагаў рабоце заводу. Некаторыя рабочыя заявілі, што яны першы раз бачаць на заводзе т. Рудзь і гэта ў той час, калі ён быў прызначаны да парт'ячэйкі. У **Віцебску** са складу праверкому была адведзена член партыі **Бу.б'ндэр** таму, што, зьяўляючыся загадчыкам культурна-масавым сэктарам прадпрыемства камбінату, праваліла масавую работу на камбінаце. Вельмі правільна, і гэта заслугоўвае ўвагі, зрабіла віцебская раённая камісія. Абмяркоўваючы кандыдатуру **т. Гіцовіча,** які па ўсіх патрабаваньнях падыходзіў-бы ў склад праверкому, камісія адвяла яго часова са складу праверкому таму, што Гіцовіч не забясьпечыў сваячасова скаканьня пляну сяўбы і прыгарадныя гаспадарцы.

Важнейшая ўмова пасьпяховасьці правядзеньня чысткі — гэта **папярэдняя падрыхтоўчая работа.** А трэба проста сказаць, што наша партарганізацыя рыхтавалася дрэнна. Арганізаваная ў 10 раёнах праверка падрыхтоўкі да чысткі (**Жлобін, Полацак, Верша, Талачыно, Заслаўе, Клімавічы** і інш.) паказала, што прапрацоўка пастаноў аб чыстцы праведзена фармальна, не ахапіла ўсёй масы партыйцаў і прайшла з малым узьдзеем беспартыйных. Падрыхтоўчая работа праходзіла ў раздаву чарговасьці: спачатку сяўба, пазьняка, а потым ужо чыстка, ня зьвязваючы аднаго з другім, з тым, каб на пастанове аб чыстцы мабілізаваць увагу на выкананьне гаспадарчых задач.

Глыбока памыляюцца тыя партыйныя камітэты і ячэйкі, якія, правёўшы адзін-два сходы на прапрацоўцы пастановы аб чыстцы, лічаць, што ўсё ўжо зроблена і што ўсё ў парадку. Вы ніякі такой падрыхтоўкі адразу-ж адчуліся ў першыя дні чысткі. Так, у **Заслаўі** і **Лагойску,** прапрацаваўшы на станову аб чыстцы, ніякай іншай работы не правялі, у прыватнасьці, ня былі арганізаваны брыгады па праверцы работы і стажу ячэек, і раённым камісіям па чыстцы ўсю гэту работу прыйшлося арганізоўваць самім, прыехаўшы ў раён. У **Воршы** райправеркамісіі прыйшлося пачынаць з папулярызацыі чысткі, распрацоўваць лёзунгі і т. д.

У **Талачыне** да таго наблыталі, што райком ніяк ня мог устанавіць, колькі ў яго парт'ячэек, спачатку налічвалі 51 ячэйку, потым 46, 47 і, нарэшце, спыніліся на 48.

Моў месца рад выпадкаў зрыву праверачных сходаў па віне парт'ячэек, як гэта было на заводзе імя **Мясьнікова** ў Менску, на заводзе **«Чырвоны кэмік»** і з кіраўніцтва воднага басэйну ў Гомелі, у парткалектывах чыгуначнікаў у Жлобіне. Тут побач, у Менску, у ячэйцы таварышча **«Прыхільнік дзяцей»** мела месца яўнае скажэньне задач падрыхтоўкі да чысткі. У гэтай ячэйцы арганізавалі камісію садзейнасьці чысткі, якая ператкварылася ў свайго роду «камісію на чысткі». Гэта камісія апытвала членаў ячэйкі і беспартыйных, паставіла пытаньне так, што ўвесь матар'ял павінны былі адказаць у гэту «камісію» (ці не таму, што члены партыі ячэйкі баяцца, каб матар'ял папаў адразу ў парадкую або раёнскую камісію?).

Нералічаных фактаў нельга цярпець, і трэба пакарэдаць усіх, што за такія адносіны, за такую падрыхтоўку, незнатыя будуць прыцягвацца да суровай адказнасьці як з боку парткамітэту, так і праверкомаў. Гэта павінна паслужыць урокам для тых партарганізацый і ячэек, чыстка якіх пачнецца ў бліжэйшы час. **Трэба рашуча адмесьці настрої, што падрыхтавацца можна за некалькі дзён да чысткі.** Трэба весьці паглыбленую падрыхтоўку да чысткі і выходзіць ня толькі з фармальнага ліку праведзеных сходаў.

Там, дзе пачалася чыстка, ужо першы сходы паказалі, што задачы і напрамак чысткі правільна ўсьвядомлены большасьцю партыйных арганізацый і шырокай масай сьвядомых беспартыйных рабочых і калгаснікаў. Аб гэтым сьведчыць іх актыўнасьць, шчырае жаданьне дапамагчы партыі ачысьціць свае рады ад усяго нягодзнага. Праверкомы з дапамогай партыйнай і беспартыйнай масы, дзякуючы праўдзівай пільнасьці і самакрытыкі, выявілі ўжо і пацярасці з партыі нямала таксіх, як якіх так падрабязна ўказана ў пастанове ў разьдзеле «Хто вычышчаецца з партыі».

Разам з тым, перад нашымі праверачнымі камісіямі, перад усёй партыйнай арганізацыяй у большасьці прайшлі вытрыматы, адданыя справе партыі камуністы, якія паказалі ўсоры сапраўдных сацыялістычных адносін да працы.

Было-б шкодным не гаварыць аб тых недахопах, якія меліся як у арганізацыі чысткі, так і ў рабоце некаторых саміх праверкомаў. Аб гэтым асабліва неабходна сказаць і напомніць для таго, каб дапушчаныя спачатку чысткі памылкі неадкладна і энэргічна зьмяніць і не дапускаць іх у далейшым.

Перш за ўсё трэба напомніць аб невыстарчальна разгорнутай самакрытыцы, што навярэдзіла ў некаторых месцах. Куды варты такія даклады, у першую чаргу сакратароў парткалектываў, у якіх няма самакрытыкі сваёй работы, якія не гаварылі і не называлі канкрэтных людзей, або калі самакрытыка дапускаецца ў аптэчных дозах для прызнаваньня або больш у мэтах выгадаваньня сябе і пакрываньня недахопаў? А менна такія да клады мы мелі ў Менску, на заводзе імя Мясьнікова, у Гомелі — у Пялсдруку, у Дрысе — ячэйка пошты і яшчэ сям-там у іншых раёнах.

А бальшавіцкая-ж самакрытыка імем на забясьпечвае поспех чысткі, забясьпечвае ускрыцьцё ўсіх бялячак, памылак, недахопаў у рабоце і кожнага камуніста і ўсёй правядзеньня партарганізацыі з мэтай іх зьнішчэньня.

У некаторых ячэйках ня быў забясьпечан належны ўдзел у чыстцы беспартыйных, напрыклад, на

Палітаддзелы МТС—арганізатары рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў

Прыклад лепшых палітаддзелаў

(З вопыту работы палітаддзелаў Менскай, Ветрынскай, Рагачоўскай і Полацкай МТС)

Нашы пазыкі, якія па працягу першай пяцігодкі далі дзесяткі мільёнаў рублёў на фінансаванне індустрыі, калектывізацыю сельскай гаспадаркі і культурнае будаўніцтва, карыстаюцца вялікім падтрыманнем шырокіх мас горада, і вёскі. Яны злучаюць у сябе агульнадзяржаўныя інтарэсы з інтарэсамі кожнага падпісчыка.

У рэалізацыі дзяржаўнай пазыкі на вёсцы прымалі актыўны ўдзел палітаддзелы МТС і саўгасаў. Палітаддзел **Ветрынскай** МТС (Полацкі раён) шырока разгарнуў работу па падпісцы на пазыку першага году другой пяцігодкі па калгасах, якія абслугоўваюцца гэтай МТС. У выніку гэтага рэалізавана пазыкі па калгасах МТС на 130.110 руб або 125 проц. кантрольнай лічбы.

Палітаддзел **Полацкай** МТС карыстаючыся бальшавіцкімі мэтадамі работы і шырока разгарнуўшы масавую работу, правёў падпіску па 100.745 руб., што складае 114 проц. задання. Добры вопыт масавай работы ёсць ў **Рагачоўскай** МТС, якая дабілася 134 проц. выканання пляну.

Ход рэалізацыі пазыкі ў другой пяцігодцы паказаў, што рад палітаддзелаў па-бальшавіцку распаўсюджвалі пазыку сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Прыкладам можа служыць работа **Менскай МТС.** 15 мая праведзен мітынг рабочых і служачых МТС, якія ўзялі на сябе канкрэтнае абавязацельства па рэалізацыі пазыкі сярод калгасаў і аднаасобнага сэктару. На заўтра палітаддзелам была выпушчана адозва да ўсіх калгасьнікаў, калгасьніц і трактарыстаў, была абсталявана агіт машына з плякатамі і лёзунгамі. Работнікі палітаддзелаў праводзілі зьлёты, сходы, на якія растлумачвалі сэнс і значэньне новай пазыкі.

Работа па рэалізацыі пазыкі цесна ўвязвалася з веснавой сяўбой і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў. У выніку гэтага Менскай МТС ужо на 20 мая плян па рэалізацыі пазыкі быў перавыкананы. Замест 147.000 руб., вызначаных па пляне, падпісаліся на 192.655 руб., але палітаддзел на гэтым не спыніўся. Ён разам з актывам калгасаў правёў значную работу па падпісцы сярод аднаасобнага сэктару.

Палітаддзел **Менскай МТС** выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва палітаддзел **Дзяржынскай і Бальшавіцкай** МТС (Менскі раён).

Палітаддзелы БССР адыгралі вялікую ролю ў рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў. Зараз перад імі стаіць вялікая задача—завяршыць падпіску ў аднаасобным сэктары. Ніводнага калгасьніка, ніводнага працоўнага аднаасобніка без аблігацыі пазыкі другой пяцігодкі—вось лёзунг, вакол якога павінна быць мабілізавана ўся савецкая грамадзкасьць.

Асноўныя мэтады падпіскі—масавая работа, паказ вопыту лепшых. Треба жорстка біць па спробах адміністраваньня і прымусовага навязваньня падпіскі. Рэалізацыя падпіскі на вёсцы павінна праводзіцца шляхам разгортваньня палітмасавай работы, сацыяпаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкага бусіру перадавых МТС, раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, брыгад у адносінах да адстаючых.

Вопыт арганізацыйна-масавай работы палітаддзелу Менскай МТС павінен быць падхоплен усімі раёнамі БССР.

РОСЬЛІК.

Ліст аднаасобнікаў Рагачоўскага раёну

Народнаму камісару фінансаў БССР тав. Хацкевічу, газэце „Зьвязда“ і „Калгасьнік Беларусі“

Мы, дэлегаты Рагачоўскага раёну, Цілхініцкага і Забалоцкага сельсаветаў, перадавых у рэалізацыі пазыкі на вёсцы, прыехаўшы ў Менск для абгаварэньня мэтадаў нашай работы ў гэтай галіне, выносім вам шчырую падзяку за аказаны нам прыём.

Пабыўшы на экскурсіі на заводзе імя Варашылава і пабачыўшы новае будаўніцтва, мы яшчэ раз упэўніліся ў тых вялікіх посьпехах, якіх дабіліся рабочыя і працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам партыі і яе геніяльнага правадыра тав. СТАЛІНА. Мы яшчэ раз упэўніліся, што кожная купленая аблігацыя пазыкі іменна выйграла.

Не супакойваючыся на дасягнутых посьпехах у рэалізацыі пазыкі, мы, прыехаўшы дамоў, мабілізуем усіх калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на 100-проц. выкананьне пляну рэалізацыі пазыкі за наўпны разьлік і бярэм на буксір Жлобінскі раён.

Мы, сераднякі—аднаасобнікі МІХАЛЬКОЎ і ПЛІСКОВА, увесь час дапамагаючы партыі і савецкай уладзе весьці рашучую барацьбу з кулацтвам, жадаем стаць сапраўднай апорай савецкай улады і заяўляем вам, што, прыехаўшы дамоў, МЫ ЎСТУПАЕМ У КАЛГАС, які зьяўляецца адзіным шляхам да пабудовы бясклясавага грамадзтва ў другой пяцігодцы.

Мы заклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх працоўных аднаасобнікаў БССР.

Няхай жыве камуністычная партыя і прыкладу сусьветнага пралетарыяту тав. СТАЛІН!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО!

ЗАВАЦКІ Д. Г., КАЛАСКОВА Н. А., МІХАЛЬКОЎ Д. С., ПЛІСКАВА Г. Я.

Калі нарэшце Сураж выканае гэтак?

Плян рэалізацыі падпіскі на пазыку другой пяцігодкі ў Сураскім раёне зрываецца. Агульнае заданьне па раёне выканана толькі на 46 проц. Па трупе рабочых і служачых процант выкананьня дасягае 40, а калгасьнікаў 16, яшчэ горш абстаіць справа з аднаасобным сэктарам. Там выкананьне кантрольнага заданьня складае толькі 0,6 проц.

Аднак РК КП(б)Б нічога ня робіць, каб ліквідаваць такое ганебнае адставаньне. Сакратар райкому тав. **Аўчынькіў** добра ведае аб бязьдзейнасьці ўпаўнаважаных па рэалізацыі пазыкі, але адносіцца да іх ліберальна.

У некаторых сельсаветах, як Маркаўскі і інш. лічаць, што зараз няма калі займацца пазыкай бо трэба капчаць пасеўную. Старшыні сельсаветаў Грыгор'еў і Сьцяпанаў таксама бязьдзейнічаюць. Апартуністычныя настроі не атрымліваюць надежнага адпору.

Падпісныя лісты ў Маркаўскім сельсавеце ляжаць не разасланымі ў калгасы, а ў Катоўскім плякаты і лёзунгі скарыстоўваюцца для пісаньня зводак. Далёкія калгасы раёну нават зусім ня ведаюць аб пазыцы другой пяцігодкі. Праца па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў яшчэ не пачыналася.

Ны гледзячы на такое ганебнае становішча райарганізацыі Суражу вельмі ніпрыхільна адносіцца да бук сірнай брыгады, якая прыехала з Віцебску, каб дапамагчы ім у рэалізацыі пазыкі. Гэтай брыгадзе нават ня далі магчымасьці выступіць на партканферэнцыі Суражскай арганізацыі.

Дакуль яшчэ Сураскі раён будзе срываць выкананьне фінпляну?

ШВАРЦ.

Архітэктар Лаўроў

Сацыялістычная рэканструкцыя гарадоў БССР

Вялізарныя посьпехі першай пяцігодкі і бліжэйшыя перспэктывы другой стварылі і ствараюць усе ўмовы для бязупыннага росту матар'яльнага і сацыяльна-культурнага ўзроўню працоўных нашай краіны.

У гэтым разрэзе і высунуты задачы будаўніцтва новых сацыялістычных гарадоў, рэканструкцыя існуючых і сацыялістычная рэканструкцыя быту.

Задача рэканструкцыі гарадоў, асабліва ва ўмовах БССР, зьяўляецца ў бліжэйшыя гады прадметам напружанай работы пад кіраўніцтвам КП(б)Б, арганізацый, устаноў і ведамстваў рэспублікі. Рэканструкцыі падлягаюць гарады: **Менск, Віцебск, Магілеў, Гомель і Бабруйск,** а ў першую чаргу Менск—сталіца БССР.

Што можна сказаць аб рэканструкцыі Менску?

Што зроблена і што робіцца ў гэтым напрамку?

На жаль, трэба канстатаваць, што бурны рост будаўніцтва ажыцьцяўляецца зусім у ненармальных (у галіне плянаваньня) умовах. Будынкі, незалежна ад прызначэньня і характару, будуюцца на зусім выпадковых вучастках, каштоўнасьць якіх вызначаецца не якой-небудзь сыстэмай ці плянам, а праблематычным разуменьнем так званага «цэнтру», паяўнасьці той ці іншай колькасьці старых будынкаў і г. д. У выніку маем згрупаваньне самых рознастайных пабудоў у адным месцы, без намёку на плянавую забудоўлю.

Такое становішча далей існаваць ня можа, неабходна скласьці праект перапляніваньня Менску.

Спробы гарадзкога савету весьці пляніваньне Менску сіламі ленінградзкага аддзяленьня Гіпрагору не даведзены да канца. Складзеная імі схема пляніваньня Менску аказалася нягодная і забракавана. Пасьля пляніваньня схемы пляніваньня неадвальняючай Гіпрагор прапанаваў Гарсавету прадставіць шмат вестак і даных для новай сыстэмы, якія могуць быць прапрацаваны асобнымі інстытутамі Беларускай Акадэміі Навук. Кошт работы арыентовачна вызначаўся ў суме каля 25-30.000 рубл. Пасьля прадстаўленьня гэтых вестак Гіпрагор вызначыў ужо новую лічбу за праект — 190.000 рубл.

Менск неабходна плянаваць на месцы, пры чым належыць прыцягнуць да работы лепшых спэцыялістаў Саюзу і толькі ў гэтым выпадку можна быць упэўненым у тым, што праектная прадукцыя адаволіць усе запытаньні новага сацыялістычнага Менску.

Улічваючы асабліву важнасьць перапляніваньня Менску, Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук стварыў спэцыяльны архітэктурна-будаўнічы сэктар па сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў БССР пры інстытуце эканомікі, на правах асобнага інстытуту.

Такія-ж інстытуты ўжо створаны і праводзяць свае работы ў Харкаве, Ленінградзе, Растове, Кіеве і Казані. Пры СНК РСФСР у Маскве па пастанове чарэнькага пленуму ЦК УсеКП(б) арганізавана Акадэмія Камунальнай Гаспадаркі—навукова-дасьледны цэнтр па распрацоўцы праблем жыцьцёва-камунальнай гаспадаркі краіны.

З Акадэміяй Камунальнай Гаспадаркі і сэкцыяй садрасьсялення Камакадэміі ў Маскве і з іншымі інстытутамі ўстаноўлена сувязь. Для работы ў інстытуце ВАН запрошан рад спэцыялістаў з Масквы, якія праводзяць работы па тэхніка-эканамічных дасьледах Менску і яго раёну, неабходных для складаньня праекту новага пляніваньня Менску.

Асноўнымі задачамі зьяўляюцца:

1. Зьбіраньне, вывучэньне і апрацоўка розных матар'ялаў па пытаньнях сацыялістычнага расьсяленьня, пляніваньня і рэканструкцыі заселеных мясцовасьцяй і архітэктурнага афарміленьня гарадоў.

2. Стабілізацыя матар'ялаў і выпрацоўка шляхам выданьня друкаванага і графічных прац.

3. Практычнае кіраўніцтва справай сацыялістычнай рэканструкцыі заселеных месц шляхам эканамічных, тэхнічных і архітэктурных кансультацый і экспэртыз.

Бліжэйшымі тэмамі ў работе інстытуту намечаны:

а) эканамічнае раёнаваньне БССР на базе сыр'ёвых рэсурсаў; б) пляніваньне і арганізацыя заселеных месц з улікам базы эканамічнага раёнаваньня; в) сацыялістычная рэканструкцыя існуючых і пляніваньне нова-будуемых гарадоў БССР у галінах: сацыяльна-бытавой, эканамічнай, планавальнай, будаўніча-тэхнічнай, санітарна-гігіенічнай і архітэктурна - мастацкай; г) пытаньні архітэктурна-мастацкага і архітэктурна-плянавальнага афарміленьня як у вогуле, так і ў асобных элементах: групы будынкаў, вуліц, кварталаў, плянёў, асобных будынкаў і эканатыўных элементаў; д) практычная распрацоўка пытаньняў сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў: Менску ў першую чаргу, Віцебску, Гомелю, Магілеву і Бабруйску; е) распрацоўка матар'ялаў пабудовы публічнай выставкі і выданьне спэцыяльнай і графічнай працы, прысьвечанай сацыялістычнай рэканструкцыі Менску, як сталіцы БССР.

Незалежна ад указанай схэмы работы інстытуту перад ім стаіць цэлы рад неадкладных задач па выпраўленьні памылак, якія дапушчаны ў пляніваньні Менску і напярэдадні магчымасьці падобных памылак, якія патрабуюць неадкладнага ўмяшаньня аўтарытэтнай плянавальнай арганізацыі.

Спачатку мяркуюць пачаць работу па пляніваньні асобных раёнаў Менску — Камароўкі (Барысаўскі тракт), дзе ўжо пабудаваны і будуюцца Клінічны гарадок, Акадэмія Навук, Палітэхнічны інстытут, Дом Друку і інш. Арыентовачная схема пляніваньня, найбольшай адлегласьці тракту ад Клінічнага гарадку да сгадыбну паказала, што будынак арыентован на будучую вуліцу-праспэкт зусім выпадкова, пад розными вуглами, з выпадковымі адступленьнямі ад будучых тратуараў, з невядомымі профілямі будучых вуліц і г. д.

Неабходна таксама неадкладна спляніваць раён Дому Ўраду і Універсытэцкага гарадку, дзе неабходна вызначыць будучы характар і прызначэньне дому Мэталістаў і ўлічыць намечаную тут-жа пабудову Цэнтральнага кіно гораду Менску.

Неадкладна трэба скласьці праект пляніваньня раёну пляцу Парыскай Камуны, дзе пачата пабудова вялікага дзяржаўнага тэатру БССР на 2.500 чал., заклікапата афарміць увесь зарочны раён, з грандыёзным перад тэатрам пляцам для ўсякага роду дэманстрацый, парадаў, масавых дзеяньняў, плян заснаваньня унутрыгарадзкога парку культуры і адпачынку на абодвых берагох р. **Сьвіслачы,** які будзе працягам парку Прафінтэрну, а таксама стварэньня цэнтральнага парку культуры і адпачынку замест існуючага на Камароўцы.

Указаныя задачы носяць тэрміновы характар і патрабуюць неадкладнага складаньня праектаў пляніваньня, у мэтах папярэджаньня няправільнай і выпадковай забудовы.

Вышэйпаказаныя мэты і задачы інстытуту складаюць толькі першапачатковую памётку работы. У працэсе сваёй работы інстытут заклікан вырашыць цэлы рад праблем жыцьцёва-камунальнай гаспадаркі рэспублікі на аснове цеснай увязкі пытаньняў яе прыродных багацьцяў, ненамерна ўзросшых культурных і матар'яльных запатрабаваньняў працоўных і вялікіх дасягненьняў навукі і тэхнікі, магчымых толькі ў краіне сацыялізму.

Каардынуючы сваю работу з Дзяржпланам, Наркамгасам, Гарсаветам і Райсаветамі і з усімі зацікаўленымі ў гэтым пытаньні арганізацыямі і падтрымліваючы цесную сувязь з аналагічнымі навукова-дасьледчымі арганізацыямі і ўстановамі брацкіх рэспублік, інстытут павінен дабіцца рашучага аруху ў справе пляніваньня і сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў БССР і, у першую чаргу, гораду Менску, як сталіцы рэспублікі, павінен усямерна садзейнічаць правядзеньню ў жыцьцё пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб камунальнай гаспадарцы.

А. Бразоўская, Я. Захарык

ВОПЫТ УЗОРНЫХ—АДСТАЮЧЫМ ШКОЛАМ

БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б дасягнуўшы буйнейшых перамог на фронце індустрыялізацыі краіны і перабудовы сольскай гаспадаркі на сацыялістычны лад, выйшла ў калёну перадавых рэспублік Савецкага Саюзу і ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Былая царская калёнія, прынечаная, культурна-запаслая, цяпер Савецкая Беларусь пасьля Кастрычніка першая з саюзных рэспублік увяла ўсеагульнае навучаньне за сямігадовую школу, прыступіла да ўвядзеньня ўсенавучу за дзесяцігодку.

Разам з хуткім ростам школьнай сеткі на працягу апошніх двух год пасьля гістарычных пастаноў ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе вялася асабліва ўпартая барацьба **за павышэньне якасьці школьнай работы.**

Бягучы 1932-33 навучальны год праходзіў у цяжкіх умовах: адсутнасьць стабільных падручнікаў, пераход на новыя праграмы з другога паўгодзьдзя, невыстарчальнае мэтадычнае кіраўніцтва работай школ. Аднак, папярэднія вынікі навучальнага году паказваюць, што, ня гледзячы на гэтыя труднасьці, вялікая колькасьць школ прышла да канца навучальнага году з высокімі якаснымі паказальнікамі.

Гэта ў першую чаргу адносіцца да нашых перадавых, сапраўды ўзорных школ.

Узорная школа імя Камінтэрну і 3-ая чыгуначная ФЗС (Гомель) дабіліся дасканалай арганізацыі пэдагагічнага працэсу. Там добра наладжана работа мэтадычных аб'яднаньняў, пляніваньне і сыстаматычна праводзіцца пазашкольная работа, ёсьць цікавы вопыт арганізацыі дзіцячага адпачынку. Вакол школ згуртован актыў бацькоў, якія дапамагаюць школам і ў гаспадарчай, і ў навучальна-выхаваўчай рабоце. Гэта, безумоўна, заслуга моцна спаянага, аддана працуючага калектыву школы і, у першую чаргу, загадчыкаў школ—**Бярэзкіна** (школа імя Камінтэрну) і **Сяржанава** (3-ая чыгуначная).

Тураўская ШКМ (загадчык тав. Сіўко) наладзіла сыстаматычную падрыхтоўку настаўнікаў па школьных заняткаў, дабілася пляніваньня ў рабоце. Праз арганізаваныя канцэнтраваныя і цыклявыя мэтада-абгаварыньні школа здолела ўзорна наладзіць мэтадычную работу.

У Тураўскай ШКМ мы маем удалы вопыт работы на прышкольным земельным вучастку, дзе культывуюцца кон, рыс, вінаград, сорга, дзе ёсьць 20 пладовых дрэў, закладзен пітомнік. Школа атрымала першынства ў абвешчаным Тураўскім РК КП(б)Б конкурсе па лепшую школу. Калегія НКА БССР прэміравала школу і яе загадчыка тав. Сіўко грашыма ў суме 750 руб.

25-ая ўзорная Менская ФЗС добра паставіла мэтадычную работу, якая канцэнтруецца ў спэцыяльна арганізаваным школьным пэдгабінэце. Пры ўваходзе ў школу, адразу бачыш парадак, чыстату, цыцыкіязванасьць вучняў. Унутраны распарадак школы можа быць сапраўдным узорам для іншых школ.

Вось Дарагакаўская ШКМ Стара-Дароскага раёну. Веды вучняў гэтай школы надзвычай высокія. Дзеці добра разьбіраюцца ва ўсім праграмным матар'яле, спыткі вучнёўскія выключна пісьменныя і чыстыя. У часе веснавой сяўбы школа правяла вялікую масава-культурную работу сярод калгасьнікаў, сваячасова засеяла свой прышкольны вучастак. Пастановай калегіі НКА БССР школа прэміявана.

Вось Прылуцкая школа, Менскага раёну, якая ў канцы навучальнага году пала высокія веды вучняў па асноўных прадметах. **У 36-й Менскай ФЗС** можна навучыцца арганізацыі па-зашкольнай работы, працы вучнёўскага самакіраваньня.

У 8-ай Менскай яўрэйскай ФЗС, якая да пачатку навучальнага году была ў глыбокім прарыве, мы маем цікавыя формы работы з адстаючымі ў галіне арганізацыі індывідуальнага спаборніцтва паміж вучнямі, настаўнікамі.

Лепшыя ўзоры пэдагагічнага вопыту і арганізацыі пэдагагічнага працэсу дасягаюцца жывымі людзьмі, перадавымі настаўнікамі.

Мы прэміравалі ведаем сваіх змагароў за пабудову савецкай палітэхнічнай школы. А іх у нас нямала. Як і на вытворчасьці, ля варштату, мы таксама маем сапраўдных герояў у барацьбе за ажыцьцяўленьне гістарычных пастаноў ЦК аб школе.

Вось настаўнік **аднакамплектовай Ольніцкай школы, Глускага раёну, Шаланкевіч** з 30-гадовым пэдагагічным стажам і 25-гадовым стажам работы ў гэтай школе. Што зьяўляецца характэрным для гэтай школы? **Ні аднаго другагодніка,** у школе няма вучня старэй за 11 год. Веды вучняў вялікія. Дысцыпліна ўзорная.

Вось тав. **Кухэн**—загадчык навучальнай часткі **23 менскай яўрэйскай ФЗС**—выкладчыца геаграфіі. **Сваю дысцыпліну выкладае па-майстэрску.** Характэрным для яе зьяўляецца творчая пэдагагічная работа і **пэдагагічныя вынаходзіцтвы.** «У каго можна навучыцца новаму?» — «У тав. Кухэн»—кажуць настаўнікі менскіх яўрэйскіх школ.

Тав. Бялькевіч—загадчык і настаўнік **Кразускай аднакамплектовай школы Стара-Дароскага раёну.** За добрую настаўніцку навучальна-выхаваўчай работы па 2-х лікпунктах, школе маланісьменных тав. Бялькевіч быў вылучан у лік лепшых ударнікаў раёну.

Тав. Прудзікава з вялікім пэдагагічным стажам, настаўніца 1-ай групы **Гомельскай ФЗД імя Камінтэрну.** Гэта ў поўным сэнсе слова артыст сваёй справы. Кожная яе лекцыя гэта—узор пэдагагічнага майстэрства. На вопыце яе работы вучацца настаўнікі школ Гомелю. Яна кіруе мэтадычным аб'яднаньнем настаўнікаў першых груп. У мінулым годзе на ўсебеларускім конкурсе на лепшую палітэхнічную школу прэміявана калегіяй НКА.

***

Папярэднія вынікі навучальнага году паказваюць, што ў школах БССР ёсьць рад буйнейшых недахопаў. Шмат школ яшчэ працуюць дрэнна, прышкі да канца навучальнага году з прарывамі.

Асабліва дрэнна стаіць справа з пастаноўкай у школе палітэхнічна-вытворчага навучаньня. Маюць месца факты процінастаўленьня палітэхнічнаму іншым асноўным дысцыплінам, адсоўваньне вытворчага навучаньня на задні плян, адсутнасьць увязкі тэорыі з практыкай, у пераважнай большасьці школ — адсутнасьць рабочых пакояў.

Новы навучальны год павінен быць рашаючым у барацьбе за якасьць вучобы.

Новы навучальны год мы павінны сустрэць у поўнай гатоўнасьці: сваячасова падрыхтаваць матар'яльную базу школ, адрамантаваць памяшканьне, скончыць будаўніцтва, абсталяваць вучэбнымі прыладамі, забясьпечыць праграмамі і стабільнымі падручнікамі, падрыхтаваць і перападрыхтаваць неабходную колькасьць кадраў, поўнасьцю ўкамплектаваць школы.

Усе школы павінны ўключыцца ў конкурс на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году, абвешчаны калегіяй НКА БССР.

Ад посьпехаў паасобных перадавых школ перайсьці да шырокага якаснага ўздыму ўсёй масы нашых школ, канчаткова зьнікньць карэнным недахопы школы,—вось баявая задача, якая стаіць перад намі ў будучым навучальным годзе.

Гэту задачу мы павінны выканаць. Ужо зараз, не адкладаючы ні аднаго дня, мы павінны распачаць падрыхтоўку да новага навучальнага году.

У Магілеве за крытыку зьнімаюць з працы

(ЛІСТ ЗАГАДЧЫКА БОЛЬНІЦЫ)

Сам я рабочы, па прафэсіі скарняк, член партыі з 1921 г. Два гады як працую я загадчыкам Магілеўскай больніцы імя Смашкі. За арганізацыю і добрую пастаноўку працы мяне неаднаразова прэміявалі грашыма і граматай.

У канцы лютага месяца г. г. прызначылі райздравам т. Краскіна, які з першых дзён сваёй працы пачаў прымушаць мяне па розных незаконных дзеяньні: загадаў зьвярнуць назад яго знаёмай Раўзінай прошы, узятыя больніцай за апэрацыю ў суме 25 руб., загадаў стварыць пляснуючую па штатах больніцы і непатрэбную пасаду культпрацаўніка з акладам 100 руб. у месяц. Гэтыя і шмат іншых незаконных загадаў былі адданы Краскіным з ведама і падтрыманьня старшыні райсаюзу Мадсанпрацы Сімховіч. Ня гледзячы на мае тлумачэньні, што гэта ёсьць пратакцыянізм і разбазарваньне дзяржаўных сродкаў, усё-ж Краскін і Сімховіч загадалі мне выкаваць распараджэньні, інакш я буду зьнят з працы.

Старшыня прафсаюзу Сімховіч пры выяўленьні герояў першай пяцігодкі праводзіла гэту працу габінэтным шляхам без удзелу мас і ў лік герояў першай пяцігодкі па фронце аховы здароўя ўключыла і сябе. Аб усім гэтым я напісаў у газэту «Рабочай», дзе і было надрукавана ад 24-IV 1933 г. пад назвай «Записался у герои». Цікава адзначыць, што перад гэтым 4 красавіка, г. г. за подпісам райздраву т. Краскіна, я атрымаў хадайнічаньне за № 82 на імя Наркамаховы здароўя і Наркома працы аб устанаўленьні мне, як добраму работніку, пэрсанальнага акладу. Але пасьля майго выступленьня 8-IV па нарадзе дактароў больніцы з крытыкай дзейнасьці Райздраву і старшыні саюзу, Краскін і Сімховіч мяняюць курс, пачынаюць з гэтага часу мяне праследваць, а пасьля зьяўленьня заметкі ў газэце «Рабочай» цкаваньне і праследваньне ўзмацніліся яшчэ больш. У кампанію да Краскіна і Сімховіч далучыўся і інспэктар газдраву Рубінштэйн. Урэшце ім удалося дабіцца праз Магілеўскую РКК-РСІ зьняцьця мяне з работы і я цяпер без працы. За што я зьнят з працы? За тое, што я, як на сходах, так і праз друк пачаў выкрываць незаконныя дзеяньні Краскіна і Сімховіч. Ня маючы магчымасьці знайсьці праўды на месцы, прашу рэдакцыю «Зьвязды» дапамагчы мне ўскрыць глушыцеляў самакрытыкі.

КРОЛЬ.

АД РЭДАКЦЫІ: У нас ёсьць аналагічны ліст загадчыка акушэрскім аддзяленьнем Магілеўскай больніцы спэцыяліста-асыстэнта Фурса, які ўказвае, што яго таксама зьнялі з пасады загадчыка акушэрскага аддзелення за крытыку на сходзе і ў друку, прыпісаўшы яму зусім незаконнае абвінавачаньне.

Матар'ялы як т. Кроля, так і Фурса праверены нашым карэспандэнтам, які пацьвердзіў сапраўднасьць фактаў, паказаных у лістох Кроля і Фурса. Нас зьдзіўляе тое, што Магілеўскае РКК-РСІ замест сапраўднага ўскрыцьця злачынных дзеяньняў Краскіна і Сімховіч чамусьці пайшла па няправільнаму шляху, па шляху падтрыманьня глушыцеляў самакрытыкі, па шляху сацкуі зьняцьця з працы людзей, якія выкрылі асобныя злачынствы. «Зьвязда» просіць ЦКК-РСІ заняцца гэтай справай.

ФАСФАРЫТНЫЯ БАГАЦЬЦІ БССР

Цэнтральная задача другой пяцігодкі ў галіне сельскай гаспадаркі — рашучае павышэньне ўраджайнасьці саўгасных і калгасных палёў. «Настаў час, калі ад росту гаспадаркі ў шырыню трэба павярнуць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на дадай стадыі яе разьвіцця» (пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 29-XI—31 году).

Згодна пастановы III сэсіі ЦВК СССР у гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым павінна быць узьнята ўраджайнасьць па гаспадарчых культурах на 13 проц., ільна-валакну—на 20 проц., цукровых буракох — 32 проц. і г. д. Адным з галоўных мерапрыемстваў для ўзьнятьня ўраджайнасьці зьяўляецца ўжываньне ўгнаеньня.

У другую пяцігодку на базе мясцовага сыр'ю павінна быць шырока разьвіта вытворчасьць мінэральных угнаеньняў. Сыр'ём для мінэральных угнаеньняў на ўмовах Беларусі могуць служыць фасфарыты, вапнякі, крэйда, торф і інш. Галоўная роля сярод гэтых відаў сыр'ю належыць фасфарытам, з якіх шляхам перамолу атрымліваецца фасфарытная мука, якая і служыць угнаеньнем. Пры апрацоўцы фасфарытаў сяркавай кіслатой атрымліваецца другі від угнаеньня—суперфасфат.

У межах Беларусі і прылягаючых частках РСФСР фасфарыты маюць значнае распаўсюджаньне. Але, перш чым гаварыць аб распаўсюджаньні, запасах і здабываньні гэтага каштоўнага сыр'ю, пазнаёмімся з умовамі стварэньня як саміх фасфарытаў, так і таго асяродзьдзя, у якім мы знаходзім фасфарыты.

Апрача фасфарытнай мукі і суперфасфату яшчэ ёсьць цалы рад угнаеньняў, дзе фосфар уваходзіць, як суставная частка. Гэта так званыя складаныя ўгнаеньні: азотна-фосфорнае — амафос, дыямафос і г. д.

Запасы фасфарытаў Савецкага саюзу вельмі вялікія. Гэтых запасаў хопіць на 500 год., нават пры максымальным іх выкарыстаньні. Якасьць фасфарытаў Савецкага саюзу даволі добрая. Колькасьць фосфарнай кіслаты дасягае (P_2O_5) ад 12 да 36 проц.

Фасфарыты сустракаюцца ў БССР у шмат пунктах, але ў розным стане, у розных адкладах і на рознай глыбіні. Прамысловыя запасы фасфарытаў залягаюць ва Ўсходняй частцы Беларусі, галоўным чынам, у вадазборы **Сожа**—на паўночны ўсход ад г. **Мсьціслаўля,** (раён вёскі **Гразь**) і далей на паўночны ўсход ад памянёнага пункту, у **Хіславіцкім** раёне Заходняй вобласьці РСФСР. Тут абапал ракі **Сож,** каля в. **Стайкі, Разанска, Чэрнікава,** вуроч. **Зубоўшчына** і інш. залягаюць фасфарыты на плошчы каля 15 кв. клм. (паводле даных был. трэсту Белгеаразьведка). Фасфарыты відомы па Беларусі або ў выглядзе паасобных жаўлакоў, наздраватых каменьняў, раскіданых у масе пяску, або ў выглядзе пліты, р. зн. пескавікоў, цэмантаваных фосфарна-кіслым кальцыем.

Найбольшае значэньне маюць адклады фасфарытаў у выглядзе так званай «фасфарытавай пліты», якая становіць сабой фасфарытызаваны пескавік, залягаючы ў глаўканітавых пясках крэйдавага часу.

Для характарыстыкі гэтых адкладаў разгледзім месца выхаду на дзённую паверхню крэйды і фасфарытаў на правым беразе ракі **Сож** каля в. **Гразь.** Тут рака падмыла правы бераг і стварыла прыроднае агаленьне, дзе выразна відаць заляганьне фасфарытаў сярод іншых парод.

[illegible] тляўканітавымі пяскамі, якія ўключаюць пасасобныя канкрэцыі і фасфарытную пліту.

У агаленьні вурочышча **Скала** каля в. **Гразь** пліта фасфарытаў залягае ў пэра-зялёных глаўканітавых пясках у сярэднім на 65 см., ніжэй белай крэйды.

У некаторых выпадках пліта суцэльнага фасфарытнага пескавіку замяняецца паасобнымі жаўлакамі фасфарытаў.

Пліта фасфарыту гэтага гарызонту мае шырокае распаўсюджаньне і пазамежамі БССР.

Паводле вестак былога трэсту Белгеаразьведка залежы фасфарытаў на паасобных вучасках характарызуюцца наступнымі данымі: **в. Бахараўка** ў 12 клм. на паўночным усходзе ад **Мсьціслаўлю,** на левым беразе р. **Сож.** Яе прамысловая плошча вылічаецца ў **62** га з запасамі фасфарыту **да 462** тыс. тон. Вёска **Гразь,** вурочышча **Скала,** у 13 клм. на паўночны ўсход ад таго-ж Мсьціслаўлю, на правым беразе р. Сож — плошча 42 га з запасамі фасфарыту 322 тыс. тон і цэлы рад іншых раёнаў маюць вельмі багатыя залежы гэтага каштоўнейшага віду ўгнаеньня.

Апрача гэтага, на Беларусі ёсьць шмат пунктаў, дзе знойдены фасфарыт ў тым ці іншым стане, якія ня маюць пакуль што яшчэ практычнага значэньня. Так, каля самага **Мсьціслаўлю** ва ўрочышчы **Цялячыя Рвы** ёсьць фасфарыты ў чацьвярцёвых адкладах. Тут фасфарытавыя жаўлакі ў скавіка—шэрага колеру і гліністы чорнага. Яны сканцентраваны, галоўным чынам, сярод галькі вапняковых і крышталёвых парод і гравійнага пяску. Фасфарытныя жаўлакі таксама знойдзены і на Траецкай Гары (у ваколіцы Мсьціслаўлю). Цэлы рад іншых мясцовасьцяй вакол ракі Сож маюць [illegible] частцы БССР трэба адзначыць **Кастрыцкую Слабаду** (Бабруйскі раён). Тут фасфарытныя жаўлакі знойдзены ў двух розных гарызонтах разам з адкладамі крэйды. Першы гарызонт — сьветлашэрых пясковых, прыкрываючых крэйду; другі гарызонт — зялёнаваташэрых пясковых, падсьцілаючых крэйду. Зграмаджэньне фасфарытаў нязначнае. У тым-жа Бабруйскім раёне ў 3-х кілёмэтрах на захад ад станцыі Бабруйск каля в. **Кісялевічы** фасфарытныя жаўлакі выяўлены ў зялёнавата-шэрых глаўканітавых пясках, падсьцілаючых крэйду.

Асаблівую каштоўнасьць набываюць багатыя залежы фасфарытаў, выкрытыя геалёгам геалёгічнага інстытуту Беларускай Акадэміі Навук **Малярзвічам** летам 1932 году у **Бабруйскім** раёне каля в. в. **Ахсціч і Навасёлкі.** У вызначаных пунктах фасфарыты пластамі залягаюць 2-мя пластамі, прычым агульная таўшчыня хістаецца ад **50** да **90 см.,** а ў адным выпадку амаль **2** метры.

Умовы эксплёатацыі залежаў фасфарытаў вельмі спрыяючыя, бо магутнасьць пераакрытых пустых парод на дасьледванай плошчы не перавышае 2-3 мэтры, а ўзровень грунтовых вод амаль ніпо на ўсёй плошчы залягае ніжэй фасфарытнага пласту. Залежы фасфарытаў у гэтым раёне трэба лічыць буйнейшымі з адомных да гэтага часу на тэрыторыі БССР. У гэтым-жа раёне знойдзены больш квадравыя пяскі, якія могуць быць скарыстаны для шкляной прамысловасьці.

Даныя аб фасфарытах у раёне в. Ахсціч і Навасёлкі зьяўляюцца яшчэ ня зусім поўнымі, бо разьведак спэцыяльнага характару там не вялося. Але тых даных, якія ёсьць цяпер, даволі для таго, каб сказаць, што гэты раён абяцае набыць поўнае значэньне, як раён прамысловы. У адносінах пля-

3-х кілёмэтрах працякае сплаўная рака **Суша,** у 6 кілёмэтрах шаша **Бабруйск-Магілеў.** Усё гэта прымушае зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэту мінэральную базу для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Трэба адзначыць, што з матар'ялаў дасьледаў відаць, што з усіх гарызонтаў, якія маюць адклады фасфарытаў або ў выглядзе пліты, або жаўлакоў прамысловае значэньне

Прамова тав. ЛІТВІНАВА на лёнданскай эканамічнай канфэрэнцыі

ЛЁНДАН, 14. (ТАСС). Пасьля амэрыканскага міністра па замежных справах Хэлла пры напружанай увазе пераноўпевай залі выступіў тав. Літвінаў, спатканы воплескамі.

СССР ня ведае крызісу

На працягу апошніх 6 год, — пачынае сваю прамову тав. Літвінаў, — савецкі ўрад трэці раз прымае запрашэньне ўзяць удзел у міжнароднай канфэрэнцыі, прысьвечанай эканамічным праблемам, ня гледзячы на тое, што мой урад мае свае асобныя погляды на законы эканамічнага разьвіцьця ва ўмовах капіталістычнага ладу і на прычыны, якія параджаюць вострыя крызісы, уласьцівыя гэтай сыстэме. Дзякуючы асаблівасьцям эканамічнай структуры маёй краіны сусьветны крызіс ні ў якай меры ня можа ўплываць і ня ўплывае на бязупынны ўздым яе эканамічнага жыцьця, што пацьвярджаецца адсутнасьцю такіх зьявішч, як перавытворчасьць тавараў, накапленьне запасаў, якія не знаходзяць збыту, беспрацоўе, павялічэньне эміграцыі, запазычанасьці, банкруцтвы і паданьне зарплаты. Тым ня менш, крызіс робіць шэўны ня спрыяльны ўплыў на разьвіцьцё нашага эканамічнага гандлю.

Маючы поўную магчымасьць, дзякуючы пасьпяховаму выкананьню першага пяцігадовага пляну, разьвіваць сваё будаўніцтва, не залежачы ад імпарту замежных рынкаў, мой урад тым ня менш ні мае намеру адгарадзіцца ад вышэйшага сьвету эканамічнымі бар'ерамі і заключыць сябе ва ўласную эканамічную скарлупу. У адрозьненьне ад іншых краін побач з буйным павышэньнем уласнай вытворчасьці, мы ня імкнемся да аўтаркіі і не адмаўляемся ад выгоднага ўвозу замежных тавараў.

Наш старшыня ў сваёй уступнай прамове намаляваў даволі сумны вобраз сённяшняга эканамічнага становішча. Ён упамянуў аб 30 мільёнах беспрацоўных з іх сем'ямі і іншымі асобамі, якія ад іх залежаць, але наўрад ці будзе пераперавялічэньнем сказаць, што ў цяперашні час звыш 60 мільёнаў чалавек зьдуць поўнагодзіннае існаваньне ў краінах, ахопленых крызісам.

У той-жа самы час у наяўнасьці катастрафічнае скарачэньне заработку тых, хто працуе, што яшчэ працуе, і адпаведнае падзеньне пакупной здольнасьці і спажываньня, якое прыводзіць да вялізнага накапленьня запасаў, ня кажучы на рэзкае зьніжэньне прадукцыі і бясспрыкладнае сьцісьненьне замежна-гандлёвых абаротаў.

Я ўжо адзначыў, што адзнакі крызісу адсутны ў Савецкім саюзе, якому прыблізна на 100 млн. даляраў каляровых металяў, на 200 млн. чорных металяў, на 100 млн. даляраў тэкстыльнага, скуранога сырцу і каўчука, прыкладна на 400 млн. абсталяваньня, уключаючы чыгуначнае абсталяваньне на 100 млн., прыкладна на 35 млн. сельска-гаспадарчых тавараў, уключаючы і племянную жывёлу, на 50 млн. даляраў такіх спажывецкіх тавараў, як чай, какао, кава, селядцы, на 50 млн. новых суднаў, пераважна для прамысловых мэтаў, як рыбалоўныя, зьвярабойныя, зямлячарпалкі і г. д. Значэньне гэтых пічбаў стане больш відавочным, калі я скажу, што ў выпадку рэалізацыі гэтых заказаў яны складуць для такіх металяў, як алюміні, нікель, медзь, сьвінец, ад 25 да 60 проц., а для некаторых з памянёных спажывецкіх тавараў — да 100 проц. існуючых сусьветных запасаў. Для машыннага абсталяваньня, прыкладна, адна трэцяя частка гадавога сусьветнага экспарту, а для суднаў — 100 проц. усяго сусьветнага вырабу мінулага году.

Мне застаецца яшчэ толькі дадаць, што ў збыце пераліччаных мною тавараў зацікаўлена вялізарная большасьць краін, тут прадстаўленых. Я навінен падкрэсьліць, што прыведзеныя лічбы выходзяць за рамкі плянаў, выпрацаваных ужо савецкім урадам, і не адносяцца да тавараў, у якіх ён адчувае значную патрэбу і якія падлягаюць заказу пры цяперашніх умовах.

Мы хацелі толькі паказаць канфэрэнцыі шлях, на якім, на нашай думцы, можна было-б дасягнуць эфэктыўных рэзультатаў у справе зьмякчэньня крызісу і паказаць прыклад другім дэлегацыям. Нам думаецца, што калі і другія дэлегацыі з такой-жа шчырасьцю і акрэсьленасьцю намецяць, калі яны змогуць, імпартныя магчымасьці іх краін і ўмовы, пры якіх гэты імпарт можа быць ажыцьцёўлен, то існуючы ў міжнародных і эканамічных адносінах хаос будзе ў поўнай меры зменшан, будзе знойдзен шлях, які вярнее за ўсе іншыя зможа прывесьці канфэрэнцыю да намечанай ёю мэты.

Супроць усіх відаў эканамічнай агрэсіі

Выказваючы такія мысьлі, мы не зарашаем канфэрэнцыю пакінуць без увагі такія бакі праблемы, як, напрыклад, штучныя перашкоды і бар'еры, існуючыя ў галіне зьнешня-гаспадарчых адносін. Мы ўсё ж не адмаўляем, што дастасаваньне дзяржавамі ў іх зьнешніх гаспадарчых сувязях мэтадаў эканамічнай вайны сярэйшае нагоршаньню і без таго досыць напружанага міжнароднага эканамічнага становішча. Тоды адносяцца рознастайныя мэтады абмежаваньняў (стварэньне асаблівых выгодных умоў), мытныя войны, якія ідуцца адкрыта або ў замаскаванай форме, валютныя войны, забарона ўвозу або вываз ў дастасаваньні да пасобных краін і ўсякія віды афіцыяльнага байкоту.

Я меў ужо выпадак у якасьці дэлегата ў камісіі па вывучэньні пытаньня аб эўранэйскім саюзе рэкамэндаваць эканамічнае разгружэньне, прапанаваўшы ў заключэньне пакт аб эканамічным ненападзе. На жаль, гэты праект сам падпаў нападу і быў заключан у адну са сьцен камісіі Лігі нацый. Я напамінаю канфэрэнцыі аб гэтым прасьцце, які, па маёй думцы, аказацца яшчэ больш сучасным і патрэбным цяпер, чым у той час, калі ён прадстаўлен мною. Меры эканамічнай агрэсіі з таго часу ня толькі не скараціліся, а шырэй разьвіліся і пачалі набываць усё новыя і новыя формы.

Сапраўднае, а не папяровае мытнае перамір'е

Сказанага мною даволі, здаецца, каб вы зразумелі, што, выступаючы супроць усіх відаў эканамічнай агрэсіі, савецкая дэлегацыя ня можа пярэчыць супроць унесенай на канфэрэнцыю прапановы аб мытным перамір'і. Хоць-бы існуючай у маёй краіне дзяржаўнай манаполіі замежнага гандлю мытныя аборы не адыгрываюць тэй ролі, што ў іншых краінах, бо тая ці іншая вышыня мытны ня можа проста ўплываць на агульную суму савецкага імпарту. Аднак, другія краіны зусім ня могуць адносіцца абыякава да мытных ставак, устаноўленых для іх у Савецкім саюзе. Так, напрыклад, дзяржаўныя і каапэрацыўныя, гаспадарчыя аб'яднаньні, якія маюць устаноўленыя для іх цьвёрдыя межы капітальных укладаньняў і зваротных сродкаў і свабодна маноўруючыя імі ў гэтых межах, выпісваючы абсталяваньне і тавары з-за граніцы, зацікаўлены ў тым, каб той ці іншы разьмяшчаемы за граніцай заказ нагружаў па магчымасьці меншую частку іх капітальных укладаньняў, або зваротных сродкаў. Маючы выбар для разьмяшчэньня заказаў паміж некалькімі краінамі, яны натуральна пры іншых роўных умовах, палічаць за лепшае даць заказы тэй краіне, якая карыстаецца ў сілу гандлёвых згод найбольш нізкімі мытнымі тарыфамі СССР. Такім чынам, згода савецкага ўраду на мытнае перамір'е мае немалое значэньне для іншых краін.

Савецкая дэлегацыя мяркуе, што эканамічнае перамір'е можа быць сапраўды эфэктыўным і некалькі аздаровіць існуючую эканамічную атмасфэру толькі ў тым выпадку, калі дзяржавы ня толькі адмовяцца ад увядзеньня новых мер эканамічнай вайны, але і ад ужываньня існуючых. Калі гаварыць аб перамір'і, гэтым прызнаюць існаваньне стану вайны. Перамір'е пасьля вайны азначае спыненьне ўсіх форм барацьбы і нападу, а ня толькі бязьдзеяньне пасобных відаў зброі.

Тое-ж самае павінна мець месца і ў галіне эканамічнай вайны, і перамір'е павінна азначаць спыненьне ўсякай барацьбы. Таму савецкая дэлегацыя, далучаючыся да рэзалюцыі аб эканамічным перамір'і, прапануе дапоўніць яе абавязацельствам адначасовага прыпыненьня дзеяньня ўведзеных усіх краінамі ў заканадаўчым або адміністрацыйным парадку ўсіх і ўсякіх мер эканамічнай барацьбы і ўнясе адпаведную рэзалюцыю.

Савецкая дэлегацыя хоча спадзявацца, што канфэрэнцыя на абмяжуецца прыняцьцем гэтых часовых мер і пакладзіцца аб перапрацоўцы перамір'я ў працяжны мір. Адным са сродкаў для гэтага можа паслужыць вызваленьне і ўдакладненьне савецкага праекту аб эканамічным ненападзе, які перад тварам эканамічнай вайны, што за апошнія гады ўзмацняецца, можа быць цяпер яшчэ паглыблен і пашыран.

Эканамічная варожасьць —праддзьвер'е вайны

Я ўпэўнен, што вы ўсе добра ўяўляеце сабе, што эканамічны мір магчымы толькі ў рамках усеагульнага міру ва ўсіх галінах міжнароднага жыцьця. Якія-б добрыя рэзалюцыі ня прымала эканамічная канфэрэнцыя, яны ня зробяць ніякага ўплыву на эканамічны крызіс у сэнсе яго зьмякчэньня, калі будзе працягвацца цяперашні стан усеагульнага палітычнага непакою і трывогі, пяўпэўненасьць у заўтрашнім дні і боязьнь магчымага ўзьнікненьня ў любы момант страшнейшага праўленьня эканамічнай барацьбы — вайны. Гэта пачуцьцё ўсеагульнай трывогі за апошні час ня толькі не ўляглося, а хутчэй узмацнілася, ня гледзячы на міжнародныя нарады і заключаныя пакты. Тым больш, што зараз відомы міжнародныя нарады і міжнародныя пакты, якія самі па сабе зьявіліся дадаткоўай крыніцай палітычнага непакою. Аслабіць гэты непакой і стварыць неабходную атмасферу для мірных эканамічных узаемаадносін могуць толькі радыкальныя меры ў галіне раззбраеньня і ўзмацненьня гарантый бясьпечнасьці шляхам падпісаньня двухбаковых і ўсеагульных пактаў аб ненападзе.

СССР вядзе нязьменную палітыку міру

Адным і далёка немалаважным фактарам стварэньня пачуцьця палітычнага непакою зьяўляюцца адносіны капіталістычнага сьвету да 170 млн. народу, які ўвёў у сваёй дзяржаве савецкі лад і будзе сацыялізм, г. зн. ажыцьцяўляе ідэю, выключаючую магчымасьць усякіх міжнародных войнаў і эканамічных крызісаў.

Хоць міжнародная эканамічная канфэрэнцыя 1927 году ў рэзалюцыі прызнала прынцып мірнага існаваньня на данным адрэзку гісторыі дзьвёх сыстэм — каапіталістычнай і сацыялістычнай, гэты прынцып да гэтага часу ня ўсімі дзяржавамі ператвораш у справу. Нават у галіне эканомікі дагэтуль захаваліся спэцыяльныя бар'еры, якія перашкаджаюць свабоднаму разьвіцьцю эканамічнага супрацоўніцтва паміж некаторымі краінамі і краінай Саветаў. Некаторыя краіны, якія адкінулі былі гэтыя бар'еры, час ад часу будуюць іх зноў. Са свайго боку, савецкі ўрад цьвёрда і пасьлядоўна трымаўся прынцыпу мірнага існаваньня і ўстрымліваўся ад усякіх мер агрэсіі за ўсіх асаблівасьцях міжнароднага жыцьця, за выключэньнем выпадкаў, калі яго вымушалі да ўжываньня рэпрэсій у адказ. У духу міралюбівай палітыкі свайго ўраду і прадстаўляемых ім народаў, савецкія дэлегацыі дзейнічалі на ўсіх міжнародных канфэрэнцыях, у якіх яны прымалі ўдзел. У гэтым-жа духу савецкая дэлегацыя будзе працаваць і на данай канфэрэнцыі.

Буйнейшы фактар інтэрнацыянальнага выхаваньня

Спэктаклі маскоўскага тэатру Ленсавету ў Менску

Работа маскоўскага тэатру Ленсавету ў БССР і выезд БДТ—1 у Маскву ў парадку абмену дасягненьнямі ў тэатральным мастацтве саюзных рэспублік мае вялікае культурна-палітычнае значэньне і зьяўляецца БУЙНЕЙШЫМ ФАКТАРАМ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ МАС.

Цёплая сустрэча, якая аказана тэатрам пралетарскімі арганізацыямі Масквы, Гомелю і Менску, сьведчыць аб вялікай увазе, якую надае пралетарская грамадзкасьць тэатральнаму мастацтву.

Рэпэртуар тэатру Ленсавету, які ён дэманструе рабочым БССР, даволі розностайны як па тэматыцы, так і па жанрах і ўключае ўзоры крытычнага падыходу да клясычнай драматургічнай спадчыны. Тэатр паказаў ужо ў Менску «РАЗГРОМ», інсцэнірўку Кравшэнькавым, вядомага раману Фадзеева, паказвае зараз «РЕВИЗОРА» Гоголя. У бліжэйшыя дні адбудуцца паказы: «ГАВАНЬ БУРЬ» па Бальзаку і «МИЛЛИОН ТЕРЗАНИЙ» Валентына Катаева.

Раман Фадзеева «РАЗГРОМ» апавядае аб гераічным змаганьні за Кастрычнік партызанскага атраду, на Далёкім Усходзе, які дзейнічаў у першыя гады грамадзянскай вайны ў глухой Улахінскай тайзе, акружаны японскімі інтэрвэнтамі і белагвардзейскім казацтвам.

«РАЗГРОМ» У ПАСТАНОЎЦЫ МАСКОЎСКАГА ТЭАТРУ ЛЕНСАВЕТУ.

Ставячы «РАЗГРОМ», тэатр Ленсавету высунуў перад сабой задачу—«стварыць эмацыянальна насычаны, хвалюючы і заклікаючы да змаганьня спэктакль» і пабудаваў яго ў пляне гістарычнай драмы.

Пастаноўшчыку ЗУБАВУ і таленавітаму мастаку ЛАЛЯНКОВУ ўдалося стварыць спэктакль з пэўнай рамантычнай узьнятасьцю і рэалістычным паказам героікі змаганьня за Кастрычнік.

Сілай гэтага спэктаклю зьяўляецца высокае ідэёвае і мастацкае раскрыцьцё як пасобных вобразаў (ЛЕВІНСОН, МАРОЗКА, МЯЦЕЛІЦА, МЕЧЫК, ВАРА), так і масавых партызанскіх сцэн.

Вырашаючы тэму барацьбы двух сьветапоглядаў—бальшавіка ЛЕВІНСОНА і хісткага, гістярычнага, дробна-буржуазнага, з эсэраўска-інтэлігенцкім мышленьнем МЕЧЫКА, тэатр уласьцівымі яму выяўленчымі сродкамі на высокім ідэёва-мастацкім узроўні даводзіць законнасьць перамогі бальшавіцкага сьветапогляду і крах дробна-буржуазнай рамантыкі, яе рэакцыйную сутнасьць.

Адводзячы месца ў спэктаклі асабістаму жыцьцю герояў, нават «любоўнай каніцелі» Марозка, Варкі і Мечыка, тэатр унікнуў «псыхаложаскага» ка паньня ў індывідуальных перажываньнях сваіх герояў, а нэадварот арганічна ўвёў гэты матар'ял у сюжэтны і ўнутраны зьмест п'есы, завастрыўшы сацыяльна-клясавыя моманты асабістых канфліктаў.

Кульмінацыйным пунктам спэктаклю зьяўляецца фінальная сцэнка—сцэнка 19 герояў, якія прарваліся з белагвардзейскага кола. У гэтай сцэнцы дасягаецца найбольш драматычны ўздым. Загад Левінсона штурмаваць дрыгву, узьняты настрой перамагчы ва што-б там ні стала—раскрывае ўсю сілу гэтага ідэёвага вопата. Тут момант вялізарнейшай эмоцыянальнай напружанасьці.

Барацьба невялікага партызанскага атраду перарастае ў гістарычна-няўнікнёную перамогу пралетарыяту над капіталам.

Тэатр у гэтай рабоце прадэманстраваў буйных майстраў сцэны—таленавітых і культурных акторaў. Цэнтральны вобраз спэктаклю—камандзір партызанскага атраду Левінсон (актор КАНЦЭЛЬ). Таленавіты актор стварыў натхняючы вобраз буйнай мастацкай сілы і ўзьдзеяньня.

Вобраз Левінсона ў выкананьні Канцэля абвеян цёплым пірызмам і рэвалюцыйнай рамантыкай, пры высокім ідэёва-мастацкім ўзроўні раскрыцьця вобразу.

Цікавая і захапляючая фігура ардынарца Марозка (актор Любімаў). У гэтым вобразе злучаецца самаадданасьць былога шахцёра пралетарскай рэвалюцыі з паўанархічнымі паводзінамі.

Актор ПЛОТНІКАЎ у вобразе Мечыка падкрэсьліў інтэлігенцкую рэфлекторнасьць, няўроўнаважанасьць, ідэёвае хістаньне дробна-буржуазнага фразёра, што прыняло яго, нарэшце, у варожы стан.

Нельга не падкрэсьліць таленавітай игры ЧАВУСАВА ў ролі Мяцеліцы і МАЦІСАВАЙ у ролі Варкі. Маючы тэкст амаль выключна бытавога пляну, акторка здолела майстэрскім выканаьнем выпукліць рэвалюцыйныя якасьці ўдзельніка партызанскага атраду.

Увесь спэктакль дэманструе высокі ўзровень сцэнічнага майстэрства і глы



УЧОРА НА СПАБОРНІЦТВАХ ПА БАРАЦЬБЕ.

Усесаюзнае спаборніцтва па цяжкай атлетыцы

Масква ўперадзе

Другі дзень спаборніцтваў па падыманьні цяжараў прайшоў вельмі ажыўлена. Лепшыя вынікі дня ў рыўку адзьвюма рукамі далі наступныя таварышы:

Па найлягчэйшай вазе Данской (Украіна), Акап'ян (Закаўказьве), Лапідус (БССР), Кантаровіч (БССР) — 70 кілёграм.

Па лягчэйшай вазе: Папоў (Украіна) — 85 кгр.

Па поўлягчэйшай вазе: Ручкін (Масква) — 85 кгр. і лёгкай — Шатоў (Ленінград) — 95 кгр.

Па поўсярэдняй вазе Ганіза (Масква) — 90 кгр.; сярэдняй — Папякоў (Масква) і Шульц (Закаўказьве) — 90 кгр.

Па поўцяжкай вазе Крылоў (Масква) і Назараў (Масква) — па 100 кгр.

Па цяжкай вазе Амбарцум'ян (Закаўказьве) — 100 кгр.

ПА ШТУРШКУ АДНЭЙ РУКОЙ. Па найлягчэйшай вазе Данской (Украіна) — 72,5 кгр.; лягчэйшай Папоў (Украіна), Пятроў (Ленінград) — 75 кгр.; па поўлягчэйшай Рапапорт (Ленінград) — 87,5 кгр., лёгкай Шатаў (Ленінград) — 80 кгр.

Па поўсярэдняй вазе Марозка (Ленінград) — 85 кгр., сярэдняй — Ганікоў (Масква) — 90 кгр.; на цяжкай — Крылоў (Масква) — 95 кгр., Амбарцум'ян (Закаўказьве) —

Трэці дзень спаборніцтваў па падыманьні цяжараў у асноўным значыў месцы ўдзельнікаў, за чэньнем першага і другога.

ПА ШТУРШКУ ДЗЬВЮМА РУКАМІ. Па найлягчэйшай вазе Мазо (БССР) устанавіў новае усесаюзнае сяменьне, штурхнуўшы 95 кг.

Два лепшыя цяжкаатлеты па падыманьні цяжараў з кожнай вагі ры 15 чэрвеня змагаліся за месцы.

Адульныя вынікі па падыманьні жараў. На першае месца выйшаў лектыў МАСКВЫ, на другое — ГРАД, за імі — УКРАІНА, БССР КАЎКАЗЬЗЕ вечарам 15 чэрвеня ліся за трэцяе, чацьвертае і пятае сца, маючы на рахунку 15 — больш-менш роўныя вынікі.

Трэці круг барацьбы

14 чэрвеня ў клюбе імя Сталіна бараліся дзьве пары.

У найлягчэйшай вазе дасканала бараліся Малякоў (Масква), Вартанчы (Закаўказьве), Крыжаноўскі (Украіна), Гудзенаў (Горкаўскі край) і узбек Рызаеў.

У лягчэйшай вазе без паражэньняў ідуць Барзоў (Масква), Сіроцін (Украіна) і Сарганскі (Паўночны Каўказ). Усе трое трапілі ў фінал. Па гэтай-жа групе трэба адзначыць моцнага барца Законскага (Закаўказьве).

У поўлёгкай вазе ўперадзе ідзе Баскакоў (Масква), які мае тры перамогі. Шансы на першае месца мае таксама Люлякоў (БССР), Лук'янчанка (Паўночны Каўказ), Коўтун (Украіна) і Лаўроў (Горкаўскі край).

У гэтай-жа групе вельмі ўдала выступае пяводзкі рабочы спартсмэн тав. Нільсон. У даны вечар ён зноў паказаў сябе бліскучым па тэхніцы барцом.

У поўсярэдняй вазе галоўныя кандыдаты на пярэмпіства Катулін (Масква) і Кока (Карэлія) далі чарговую схватку, у выніку якой Катулін залічыў перамогу за знаходжаньне. Іваноў (Горкаўскі край) лажыў моцнага Шыгаева (Паўночны Каўказ). Найбольшы шансы на групе ў Катуліна, Кока і Шыгаева.

Па поўцяжкай вазе Баранаў (Паўночны Каўказ) у дабіваньні на лопаткі выйграў у Радзюка (Украіна). Кары (Карэлія) за тры мінуты перамог Мацёмкіна (Захоўная вобласьць). Сакіч Пыльно — Жбанава (Украіна) першае месца відовочна выйдзе Пыльноў.

Нарэшце, у цяжкай вазе многіх з усіх удзельнікаў сьвята Пустынікаў (Паўночны Каўказ) на другое месца ідзе Казанскага (Масква). Па гэтай групе вызначыліся Пустынікаў, другое — Гаўрэцкае — Куусала.

Спаборніцтвы па боксу

Раніцой 15 чэрвеня на рынгу разгарнулася суспрэчка ў трох матах. У першай пары лёгкай вагі Шэлягін (Ленінград) хутка давёў свайго праціўніка да адмаўленьня. Сапрэмчэнка (Украіна) дуна стомлен цяжкімі боямі папярэдніх дзён — у другім раўндзе ён сышоў.

Другая пара — схватка за пярэмпіства ў поўлёгкай вазе паміж Шчуплёкам (Ленінград) і Цалавальніказым (Масква). Гэта сустрэча чакалася з вялікай нецярпіваснасьцю.

Раўнд дае невялікую перавагу маскавічу. У другім раўндзе ленінградзец, які даскапала біўся напярэдадні, не праяўляе актыўнасьці. Атакі Цалавальніка, нэадварот, становяцца ўсё больш імклівымі. Перамогу заслужана атрымаў Цалавальніказ.

Наступная пара лёгкай вагі Цімафееў (Ленінград) і Кірэеў (Масква). У Цімафеева больш бакёрскага вопыту. Але і Кірэеў дасканала праявіў сябе ў папярэдніх баёх. Першы раўнд прахадзіць роўна. Пасьля перапынку Цімафееў пачынае цясьніць свайго праціўніка, аднак, большасьць удараў у ход на рукавічках. Кірэеў добра ўдары і да канца раўнду пасьля бачыцца некаторай перавагі. У раўндзе Цімафееў дасягнуў больш, чым, увесь час апусканьня ніжка на вяроўкі. Схватка прыняла, амаль без удараў, адкрытая вага Цімафеева ўжо відовочна. Ён мога прысуджаецца яму.

У апошняй пары сустрэліся сярэдняй вагі — Лебедзеў (Ленінград) і Ермакоў (Масква). Першыя хвіліны не даюць вялікіх вынікаў. Чарговуюцца. Ермакоў атрымлівае заўвагі за направільныя ўдары. Апошні раўнд Ермакоў выйшаў з стомленым. Лебедзеў усталёўвае і выігрывае раўнд і сустрэчу, заняўшы прадзіраджаючы сваю высокую бакёрскую клясу.

В.

Сёньня на стадыёне

Закрыцьцё ўсесаюзнага цяжка-атлетычнага сьвята адбудзецца сёньня 16 чэрвеня ў 4 гадзіны 30 хв. на цэнтральным стадыёне. У праграме: парад удзельнікаў і фізкультурнікаў Менску, абвяшчэньне вынікаў сьвята, масавыя вольныя рухі, таварыскія сустрэчы мацнейшых майстраў СССР па боксу, барацьбе і гірам, эстафэты 8 на тысячу м. і шэдзкая (800—400—100 м.) і матч лепшых валягоначыкаў Саюзу т. т. ІПАЛІТАВА, КАЗЛОВА і інш.

Уваход бясплатны. На стадыёне — беларуская выстаўка фізкультуры. Она адбудзецца пры ўсякім надвор'е.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНЕЦ

Бліжэйшыя імпартныя магчымасьці СССР —1 мільярд даляраў

Сусьветная эканамічная канфэрэнцыя, якая зараз сабралася, стаіць вайей задачай — адшуканьне мераприемстваў, накіраваных далі не да жыцьця, то да зьмякчэньня крызісу. Таколькі можна меркаваць па рабоце экспэртаў, падрыхтаваўшых парадак дня для канфэрэнцыі, мяркуецца зьвярнуць увагу галоўным чынам на абмежаваньне вытворства, тарыфаў, мэтадаў кредытнай палітыкі, павышэньне ён. Не ўдаваючыся ў тэарытычную выскусію на гэтых пытаньнях, савецкая дэлегацыя ўсётакі дазваляе сабе выказаць сумленьне ў тым, каб намечаныя мэтады маглі адыграць сур'ёзную ролю ў справе зьмякчэньня крызісу. Па думцы савецкай дэлегацыі, большае значэньне трэба надаваць магчымасьцям расходваньня сусьветных запасаў, якія аказваюць націск на рынак, і павышэньню загрузкі прадпрыемстваў, выробляючых сродкі вытворства. З гэтага пункту гледжаньня савецкая дэлегацыя мяркуе, што канфэрэнцыя аказалася-б больш плённай, калі-б на магла пачуць ад усіх дэлегацый, якія магчымасьці ажыўленьня ў гаспадарчым жыцьці і пашырэньня імпарту сьць у іх краінах, і прадпрыняць адпаведныя дзеяньні. Са свайго боку савецкая дэлегацыя гатова даць адказ на гэтыя пытаньні ў адносінах дзяржавы, якую яна прадстаўляе.

Савецкі ўрад складае, як правіла, вае імпартныя пляны ў поўнай адпаведнасьці з экспартнымі магчымасьцямі і кредытнымі ўмовамі. Савецкая дэлегацыя мысьліць сабе ўмовы накшталт працяжных кредытаў, нармальных умоў для савецкага экспарту і іншых прыяючых фактараў, якія дазволілі-б расшырыць гэтыя пляны, а гэта магло-б аказаць немалы ўплыў на зьмякчэньне існуючага крызісу. На падліках савецкай дэлегацыі, савецкі ўрад пры наяўнасьці памянёных умоў мог-бы разьмясьціць у бліжэйшы час заграніцай заказаў на суму прыкладна ў 1 мільярд даляраў. Каб быць поўнай канкрэтным, скажу, што Савецкі саюз мог-бы пагашаць у бліжэйшы час

Ход торфаздабычы

(Заводы Белторфу на 13 чэрвеня)

Назва заводаў	Проц. выкананьня дзеннага заданьня.	Проц. выкананьня калядарнага пляну	Проц. выкананьня сезоннага пляну.
«Закрашын. ні мох» няма вестак	—	79,5	30,3
«Свабода»	55,6	65,1	25,0
Імя Даўмана	74,1	62,3	23,8
«Ч. Беларусь»	55,5	59,6	18,3
«Чырв. сьцяг»	49,7	54,9	18,0
Імя 1 мая	38,2	39,0	12,0
Смалявічы	30,5	45,3	11,9
Асінторф «Бальшавік»	43,1 / 49,3	36,8 / 29,5	11,2 / 10,6
РАЗАМ:	43,6	44,5	14,2

Усяго з пачатку сэзону заводамі Белторфу здабыта 70.000 тон торфу, з іх машына-фармовачнага — 67.400 тон, фрэзэрнага — 1.140 тон і рэзнага — 1.500 тон. Трэба-ж было здабыць да 13 чэрвеня 157.302 тоны. Такім чынам запазычанасьць з пачатку сэзону складае больш 87 тысяч тон.

ІНСТЫТУТ ТОРФУ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК.

Сёньня, 16-VI—1933 года, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Акадэміі Навук, у залі пасяджэньня (рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай вул., дом № 29-35)

АДБУДЗЕЦЦА

ДАКЛАД

вучонага спэцыяліста інстытуту торфу тав. ЛЕПІНА Л. Я.

на тэму:

„Мэтодыка дасьледваньня торфяных залежаў і іх новейшая клясіфікацыя".

Уваход вольны.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. | Замежны мастацкі фільм БЭЛА ДОННА

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" | Мастацкі фільм „АЭЛІТА" (АНТА!... АДЭЛІ!... УТА!...)

„ПРАЛЕТАРЫ" | Мастацкі замежны фільм „Чалавек, сьмяецца" драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. | Мастацкі фільм САЛДАЦКІ СЫН у 6 частках.

„СПАРТАК" Каса—з 3г. 30м. | МАСТАЦКІ ФІЛЬМ КРЫЖ І МАУЗЭР драма ў 7 частках.

МЕНСКІ БЕЛПЭДТЭХНІКУМ

абвяшчае

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

на 1 курс

тэхнікуму і дашкальнай педагагічныя курсы. Прыём заяў з 25 чэрвеня да 15 жніўня. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй на 75 проц.

Да заяў неабходна далучыць дакументы (у арыгінале), пералічаныя ў правілах прыёму на 1933 г. і накіраваць іх на адрэсу: г. Менск, Савецкая, 107— Белпэдтэхнікум.

Дырэкцыя.

Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут у г. Горках

абвяшчае

АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ:

1. Зоатэхнічны (рыхтуе зоатэхнікаў для буйнай рагатай жывёлы).
2. Агранэмічны і глебазнаўства (рыхтуе спэцыялістаў па хэмізацыі сельскай гаспадаркі).
3. Нормаздабываньня і насеньнаводзтва (рыхтуе аграномаў па нормаздабываньню і насеньнаводзтву).
4. Ільна і канопляі (рыхтуе аграномаў па ільнаводзтву і канапляводзтву).
5. Эканомікі і плянаваньня сельскай гаспадаркі (рыхтуе эканом. плянавікоў с.-г. арганізатараў вытворчасьці, працы і тэх. нормаваньня).
6. Арганізацыі тарыторыі (рыхтуе спэцыялістаў па земляўпарадкаваньню саўгасаў і калгасаў).
7. Рабочы факультэт.

Прыём заяў праводзіцца да 1-га верасьня 1933 г. Заявы паданьня на імя дырэктара сельска гаспадарчага інстытуту гор. Горкі, БССР.

Да заявы патрэбна прылажыць наступныя дакументы:

1) анкету засьведчаную партыйнымі, прафэсіянальнымі або савецкімі арганізацыямі;
2) даведку аб узросьце;
3) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў (для сялян-адзінаасобнікаў —даведку аб с.-гасп. падатку);
4) аб выбарчых правах;
5) аб стане здароўя;
6) аб вайсковай павіннасьці;
7) аб адукацыі (арыгінал);
8) дзьве фотакарткі і
9) паштовых марак на 40 кап.

Усе прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатамі (за выключэньнем самей студэнтаў) і стыпэндыяй згодна паложэньня.

Адначасова з гэтым праводзіцца набор на завочны сэктар па вышэйпаказаных спэцыяльнасьцях.

Дырэктар Інстытуту БАРЫСЕВІЧ.

Асоб, якія ведаюць месцазнаходжаньне гр. Вазілетнікава Дзяніса (жыхара вёскі Злыкана, Слабодзкага сельсавету, Магілёўскага раёну), просьба паведаміць па адрэсу: гор. Шклоў, вёска Зарофцы, Рыжкаўскага сельсавету. Майсеевай Дар'і.

ЗГУБЛЕНА дамавая кніга дому № 20 па Крупскай вул. на імя САВІЧ Н. лічыць несапраўдным.

ДА ВЕДАМА ЯЧЭЕК МОПР'а ГОР. МЕНСКУ І РАЁНУ.

ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'а

склікаецца 25-га чэрвеня.

Да 20-га чэрвеня ячэйкі павінны скончыць перавыбары бюро і рэвіз. камісіі і не пазьней 21-га чэрвеня здаць гарному перавыбарчы матар'ял і сьпіс выбраных дэлегатаў.

Выдача мандатаў пачынаецца 22-га чэрвеня з 10 да 4 і з 7 да 9 гадзін вечара. Савецкая 87, другі паверх.

Менскі гарком МОПР'а.

Рагачоўскае аддзяленьне

ДЗЯРЖБАНКУ ПРАДАЕ

НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ

неапрацаваныя Рагачоўскім ОРС'ам Леспрамгасу:

Брукі ліфоў	—77 пар	на суму	2.354 руб.
Бацінкі мужч.	—40 пар	„	3.182 „
Боты шагранёвы	—50 пар	„	2.161 „
Пальто мужч.	—32 шт. на	„	2.964 „
Кравацы	—14 шт. на		

За даведкамі зьвяртацца ў Рагачоўскае аддзяленьне Дзяржбанку.

БАНК.

БЕЛІЦКІ ТЭХНІКУМ

БУЙНАЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ

абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР

студэнтаў у ліку 60 асоб.

Тэхнікум знаходзіцца ў 2-х кілёмэтрах ад ст. Бурбін у буйным саўгасе Беліца.

Пры тэхнікуме знаходзяцца: узорны сноты двор, малочны завод, лябіторыя, лябараторы.

Тэрмін навучаньня 3 гады.

Заявы падаюцца па адрэсу: ст. Бурбін, Ворша-Лепельскай чыгункі, п.-аддз. Беліца. Беліцкому тэхнікуму.

Заявы прымаюцца да 20 жніўня 1933 г. З 20 па 25 жніўня адбудуцца іспыты.

Да заявы прыкладаюцца дакументы, згодна даведніка Наркамасьветы.

Дырэкцыя.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ АСЬВЕТНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

на кірпы курс аргмасавага аддзяленьня.

Прыём заяў да 15 жніўня.

Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй. Раёны камплектуюць ня менш колькасьці, вызначанай разьвёрсткай. Правілы прыёму і разьвёрстка накіраваны культпропам РК КП(б)Б, РК ЛКСМБ раёнаў і райпрафсаветам. Заявы далучыць дакументы (у арыгінале), пералічаныя ў правілах прыёму і